

АНАТОЛЮ ЯРМОЛЕНКУ – 75! **7**



ВОГНЕНЫЯ ВЁСКІ. ДАЛЬКАВІЧЫ **8-9**


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛІСТАПАДА 2022 г. АЎТОРАК № 224 (29846)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзяніс МАРОЗ, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Энергетычная галіна — вельмі адчувальная і значная галіна для любой эканомікі. Маючы дарагія энергетычныя рэсурсы, немагчыма забяспечваць высокую канкурэнтаздольнасць эканомікі. З сітуацыі, якая склалася сёння на Еўрапейскім кантыненце, можна зрабіць выснову, што калі дзяржава не кіруе працэсам фарміравання цэн на энергетычныя рэсурсы, гэта прыводзіць да некантралюемага росту цэн і да магчымасці асобным энергетычным кампаніям нажывацца на бедах мільёнаў людзей. Але той падыход, які рэалізаваны ў Беларусі, правільны. Дадзеная галіна — ключавая, ёй удзяляецца павышаная ўвага з боку органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўніка дзяржавы, што дае нам магчымасць працаваць у прагназуемых, стабільных умовах і забяспечваць нашы прадпрыемствы энергетычнымі рэсурсамі па даступных тарыфах, а значыць, забяспечваць канкурэнтаздольнасць нашай эканоміцы».*

# МЫ ДА ВАС З ЦЯПЛОМ!



Маладыя людзі з БРСМ аказваюць дапамогу ў нарыхтоўцы дроў пажылым адзінокім людзям. Такім чынам моладзь далучылася да чэленджу, які стартаваў пасля першага чэмпіянату па колцы дроў сярод журналістаў і блогераў. Напрыклад, гэтыя хлопцы з таварышамі шчыравалі ў аграгарадку Лешніца Бярэзінскага раёна. Фота БелТА.

**Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія КЛІНГЛ:**

## «АДНОСІНЫ З БЕЛАРУССЮ ЗАСЛУГОЎВАЮЦЬ САМАГА ВЫСОКАГА ДАВЕРУ»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прыняцці даверчых грамат назваў Бразілію адным з найбольш значных для нашай краіны партнёраў у Лацінскай Амерыцы. Беларускі лідар выказаў перакананне, што дзяржавы не спыняцца на дасягнутых выніках і прадоўжаць паслядоўнае пашырэнне ўсяго спектра двухбаковых кантактаў, у тым ліку ў гарнарудной галіне, металургіі, нафтахіміі і іншых галінах. Як развіваецца беларуска-бразільскае супрацоўніцтва, наколькі магчымае наша ўзаемадзеянне на пляцоўцы БРІКС, калі сустрэнуцца Аляксандр Лукашэнка і Лула да Сілва, у эксклюзіўным інтэрв'ю газеце «Звязда» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Рэспубліцы Беларусь Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл.**

**СТАР. 4**

Размова па сутнасці

## ДАСТОЙНЫ АДКАЗ СУЧАСНЫМ ВЫКЛІКАМ І ПАГРОЗАМ

### Як сфарміраваць гістарычную памяць у новага пакалення?

**«Гісторыя Беларусі ў многім ваенная. Асаблівае месца ў ёй займаюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якая тым ці іншым чынам закранула літаральна кожную сям'ю. Невыпадкова памяць аб гэтай трагічнай старонцы нашай гісторыі з'яўляецца фактарам кансалідацыі беларускага грамадства. Гэта гістарычная падзея прысутнічае ў калектыўнай памяці беларускага народа, з'яўляецца падмуркам для нацыянальнай самасвядомасці». Такую думку выказала старшы навуковы супрацоўнік цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Марына КРАСНОВА падчас прэзентацыі абноўленага вучэбна-метадычнага комплексу «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.**

**СТАР. 11**

## КОРАТКА

- **Міністэрства аховы здароўя не прагназуе сур'ёзнай змены абстаноўкі з COVID-19 у Беларусі.**
- У БДУ адкрыюць спецыяльнасць «Кібербяспека».
- **Брыло: нам спатрэбіцца менш за тры гады, каб поўнасцю забяспечыць краіну сваімі яблыкамі.**


ISSN 1990 — 763X

22224



**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



З першых вуснаў

# «УСЁ ПАВІННА ЎКЛАДВАЦЦА Ў АДЗІНУЮ КАНЦЭПЦЫЮ, І ДЗЕЙНІЧАЦЬ МЫ ПАВІННЫ АДЭКВАТНА СІТУАЦЫІ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова, які праінфармаваў аб стане аператыўнай абстаноўкі ў краіне. Акрамя таго, кіраўніку дзяржавы далажылі аб развіцці сістэмы органаў унутраных спраў.**

«Людзі нашы ўжо ведаюць і разумеюць, што ў апошні час мы шмат займаемся ўдасканаленнем сістэмы кіравання ў нашай дзяржаве, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Перш за ўсё гэта датычыцца ваеннага складніка ў выніку сітуацыі вакол Беларусі, ды і ўнутры праблем хапае».

Менавіта ў такім рэчышчы былі абмеркаваны пытанні ўдасканалення дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў. Разгледзелі і шэраг іншых пытанняў, па якіх прынялі адпаведныя рашэнні. Аднак перад гэтым беларускі лідар папярэдзіў: «Прашу мець на ўвазе, ведамаснасці і якіх-небудзь празмернасцяў, якія не адпавядаюць кірункам развіцця нашай дзяржавы, быць не павінна. Усё павінна ўкладвацца ў адзіную канцэпцыю, і дзейнічаць мы павінны адэкватна сітуацыі».

Лішніх грошай, па словах Прэзідэнта, ніколі няма, не было і не будзе. «Калі трэба — значыць трэба, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Калі можам пацярпець — значыць трэба пацярпець у плане пашырэння, магчыма, нават расходаў на забеспячэнне жыццядзейнасці нашых ваенных падраздзяленняў, увогуле сілавога блока. Таму калі магчыма пацярпець — значыць трэба пацярпець да пэўнага часу. Але калі гэта ўжо наспела, то трэба хутка прымаць рашэнні».

Міністр унутраных спраў, генерал-лейтэнант міліцыі Іван Кубракоў далажыў аб аператыўнай абстаноўцы ў краіне. Прэзідэнт папрасіў коратка: ён добра ёю валодае.

Кіраўнік міліцэйскага ведамства праінфармаваў, што на бягучы момант аператыўная абстаноўка ў Рэспубліцы Беларусь застаецца кантралюемай. Па яго словах, пэўных пытанняў і рэзкіх зменянняў няма. «Органы ўнутраных спраў у першую чаргу працуюць на прафілактыку злачынстваў», — звярнуў увагу міністр унутраных спраў.

Расказваючы аб арганізацыі работы ўчастковых інспектараў міліцыі, Іван Кубракоў заўважыў, што ў МУС вярнуліся да сістэмы той савецкай школы, калі ўчастковы інспектар міліцыі працаваў з насельніцтвам менавіта на сваім участку. «Быў час, калі ад гэтага адышлі, — удакладніў ён. — Цяпер усюды створаны апорныя пункты аховы грамадскага парадку, дзе ўчастковы інспектар міліцыі праводзіць увесь свой рабочы час. Вызначылі дні, давялі іх да жыхароў. Усе ведаюць, калі старшы ўчастковы праводзіць прыём грамадзян, а ўчастковыя інспектары міліцыі займаюцца менавіта адпрацоўкай жылога сектара».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Пасля размовы з Прэзідэнтам **міністр унутраных спраў, генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ** адказаў на пытанні журналістаў. Па словах кіраўніка міліцэйскага ведамства, работа супрацоўнікаў органаў унутраных спраў на прафілактыку злачынстваў прыносіць свой плён. «Мы бачым скарачэнне забойстваў на 17 % (за 10 месяцаў бягучага года. — **«Зв».**), а таксама цяжкіх цялесных пашкоджанняў, — заўважыў ён. — Нашым супрацоўнікам удаецца своечасова знаходзіць праблемныя сем'і, кватэры і своечасова рэагаваць на тую абстаноўку, якая ёсць».

Павелічэнне злачынстваў, па словах міністра, фіксуецца толькі па махлярствах. Ад дзеянняў тэлефонных махляроў пацярпела ўжо нямала беларусаў. «Мы ў гэтым плане працуем, — адзначыў Іван Кубракоў. — Сітуацыя пераломлена, мы бачым, што ўсе званкі паступаюць з-за мяжы Рэспублікі Беларусь. Раскрывальнасць такіх злачынстваў — каля 80 %. Мы імкнёмся працаваць на прафілактыку і даводзіць да насельніцтва, куды звяртацца і што рабіць у выпадку паступлення такіх званкоў».

Што датычыцца ўдасканалення дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў, кіраўніку дзяржавы было ўнесена некалькі прапаноў. Адна з іх звязана са змяненнем структуры ўнутраных войскаў. Прапанову Прэзідэнт цалкам падтрымаў і паставіў некаторыя іншыя задачы па ўдасканаленні ўнутраных войскаў. Таксама была ўнесена прапанова па падрыхтоўцы кадраў для Міністэрства ўнутраных спраў. Беларускі лідар ухваліў рашэнне стварыць ліцэй МУС у Магілёве. Пры гэтым, па словах міністра, была пастаўлена задача — стварыць падобныя ліцэі ва ўсіх рэгіёнах краіны. «Указанне будзе прапрацавана, і мы гэту работу пачнём ужо сёння», — падкрэсліў Іван Кубракоў.

Добрая навіна

# Гуманітарны груз з Паднябеснай

**Два мільёны доз кітайскай вакцыны супраць COVID-19 хутка паступяць у медустановы краіны**

**У Беларусь прыбыў гуманітарны груз ад урада КНР, які ўключае два мільёны доз вакцыны Vero Cell ад COVID-19 і два мільёны аднаразовых шпрыцаў. Падчас падпісання дакументаў прыёму гуманітарнай партыі вакцыны міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ падкрэсліў, што кітайска-беларускае супрацоўніцтва ў барацьбе супраць каранавіруса можна назваць узорным. Акрамя яго, ва ўрачыстай цырымоніі ўзялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў КНР Юрый СЯНЬКО, намеснік старшыні Дзяржаўнага агенцтва міжнароднага развіцця і супрацоўніцтва Дэн БОЦІН, а таксама іншыя ганаровыя госці.**

Як адзначыў Дзмітрый Піневіч, Кітай застаецца найважнейшым стратэгічным партнёрам Беларусі ў рэалізацыі праектаў па многіх напрамках.

— Важна, што дамоўленасць аб перадачы беларускаму боку вакцыны была дасягнута ў ходзе сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Самаркандзе ў рамках мерапрыемстваў пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС, — сказаў міністр. — Як паказваюць апошнія 30 гадоў, узаемадзеянне паміж нашымі краінамі ўмацавалася і стала больш цесным, а сяброўства паміж двума народамі стала яшчэ больш трывалым. Мы бачым, што Кітай актыўна рухаецца наперад і дэманструе поспехі ў эканамічным і сацыяльным развіцці. З задавальненнем адзначаю, што Кітай застаецца найважнейшым стратэгічным партнёрам Беларусі.

Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем міністр назваў узорным.

— Гуманітарныя сувязі займаюць ва ўзаемадзеянні асаблівае месца. Яны збліжаюць народы, умацоўваюць давер, фарміруюць добрую аснову міждзяржаўных адносін. Сябры спазнаюцца ў бядзе. Калі Кітай, першым з усіх краін, паведаміў аб пачатку пандэміі, гэта быў моцны і мужны крок кіраўніка Кітая ў адносінах да сусветнай супольнасці. Мы назіралі і пераймалі досвед таго, як пад асабістым кіраўніцтвам старшыні КНР Сі Цзіньпіна была мабілізаваная ўся краіна. Як Кітай прыклаў вялікія намаганні і, у рэшце рэшт, дабіўся значных стратэгічных вынікаў у барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй, — падкрэсліў Дзмітрый Піневіч.

Ён нагадаў, што па распараджэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі наша краіна першая ў свеце накіравала ў Кітай самалёт з гуманітарнай дапамогай. Пазней быў адпраўлены другі самалёт. У адказ, калі пандэмія прыйшла ў нашу краіну, Кітай перадаў нам вялікі аб'ём гуманітарнай дапамогі.

Дарэчы, усяго ў 2021—2022 гадах, з улікам гэтай партыі, Кітай перадаў Беларусі ў якасці гуманітарнай дапамогі каля пяці мільёнаў доз вакцыны. Яшчэ больш за 4,6 мільёна доз беларускі бок закупіў самастойна. За перыяд з красавіка 2020-га да цяперашняга часу КНР аказала бязвыплатныя дапамогі на 25 мільёнаў долараў. У Беларусь былі пастаўлены сродкі індывідуальнай абароны, лячэбнае і дыягнастычнае абсталяванне.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн адзначыў, што кітайска-беларускае супрацоўніцтва мае шырокія перспектывы і вялізны патэнцыял.

— Пандэмія, якая пачалася яшчэ ў 2020 годзе, цягнецца ўжо тры гады, ствараючы пагрозу бяспецы людзей і эканамічнаму развіццю ва ўсім свеце. З моманту яе пачатку Кітай і Беларусь ажыццяўляе цеснае супрацоўніцтва ў сумеснай барацьбе з ковідам. Беларусь і Кітай абменьваліся гуманітарнымі грузамі са сродкамі індывідуальнай абароны, вакцынамі і іншымі медыцынскімі вырабамі. Акрамя таго, у Беларусі адным з рэзідэнтаў парка «Вялікі камень» пачаты выпуск прэпарату традыцыйнай кітайскай медыцыны.

Ён дадаў, што сам стаў сведкам таго, што ў многіх бальніцах і пунктах вакцынацыі выкарыстоўваецца кітайская вакцына. Гэта сведчыць аб даверы беларусаў да гэтага прэпарату.

### Эпідсітуацыя стабільная, запасаў лекаў, кіслароду і ложкаў звышдастаткова

Дзмітрый Піневіч падкрэсліў, што эпідсітуацыя ў краіне стабільная, запасаў лекаў, кіслароду і ложкаў звышдастаткова. Пры гэтым ён адзначыў, што, якая не была б эпідсітуацыя, важна працягваць вакцынацыю. Цяпер захваральнасць знаходзіцца на ўзроўні некалькіх працэнтаў ад пікавых значэнняў.

— Каля 70 % беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19 — гэта добрае дасягненне. І ў тым ліку яно дазволіла забяспечыць стабільную эпідабстаноўку. Цяжкіх змен мы не прагназуем. Так, у пачатку восені мы бачылі некаторае павышэнне захваральнасці, але ўздым завяршыўся. У той жа час мы павінны быць гатовы да любога развіцця падзей. Хоць, паўтаруся, не прагназуем цяжкіх змен, але гатовыя да іх, — дадаў міністр.

Дзмітрый Піневіч паведаміў, што ўжо 30 % насельніцтва прышчэплены супраць грыпу. Мяркуецца, што да 1 снежня ахоп складзе больш за 40 %.

Пракаментаваў міністр і нядаўнія чуткі аб недахопе ложкаў у адной з абласцей краіны:

— Апошнім часам на нашых нарадах я стаўлю пытанні нашым спецыялістам пра тое, што наш ложкавы фонд выкарыстоўваецца не ў поўнай меры. У нас пустуюць ложкі ва ўсіх рэгіёнах. Гэта сведчыць аб тым, што эпідсітуацыя стабільная і нават аб тым, што нам неабходна аптымізацыя. Цяпер у нас ёсць свабодныя рэсурсы, якія датычацца запасаў медыкаментаў, кіслароду, ложкаў. Да выклікаў мы гатовыя, рэсурсаў звышдастаткова.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сі Цзіньпін заклікаў Байдэна працаваць з усімі краінамі дзеля міру



Двухбаковая сустрэча старшыні КНР Сі Цзіньпіна і прэзідэнта ЗША Джо Байдэна прайшла на палях саміту G20 у Інданезіі. Аб гэтым паведаміла Цэнтральнае тэлебачанне Кітая. Сустрэча працягвалася больш чым тры гадзіны. Перагаворы сталі першай вочнай сустрэчай Сі Цзіньпіна і Байдэна пасля таго, як Байдэн заняў пасаду прэзідэнта ЗША. Апошні раз яны сустракаліся вочна ў 2017 годзе ў Давосе, тады Байдэн быў віцэ-прэзідэнтам ЗША. Сі Цзіньпін заявіў аб неабходнасці працаваць з усімі краінамі, каб «прынесці надзею на мір і ўпэўненасць у глабальнай стабільнасці». «Чалавецтва сутыкаецца з беспрэцэдэнтнымі выклікамі, свет стаіць на ростанях, і куды рухацца — гэта пытанне, аб якім задумваемся не толькі мы, але і ўсе краіны», — цытуе кітайскага лідара РІА «Навіны». Амерыканскі прэзідэнт у сваю чаргу выказаў меркаванне, што ЗША і Кітай могуць пераадолець рознагалоссі. Байдэн заявіў Сі Цзіньпіну, што Злучаныя Штаты прадоўжаць канкурыраваць з КНР, але гэта саперніцтва «не павінна перарасці ў канфлікт».

### МУС Турцыі: Анкара адмаўляецца прымаць спачуванні ЗША пасля тэракту ў Стамбуле



Кіраўнік Міністэрства ўнутраных спраў Турцыі Сулейман Сойлу заявіў, што ў краіне ведаюць, адкуль каардынаваўся тэракт у Стамбуле, таму не прымаюць спачуванняў ад Пасольства ЗША. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на тэлеканал CNN Turk. Як вядома, на турыстычнай вуліцы ў Стамбуле 13 лістапада адбыўся выбух, загінулі шэсць чалавек, звыш 80 былі параненыя. Пракуратура Турцыі ўзбудзіла крымінальную справу. Улады краіны расцэньваюць інцыдэнт як тэракт. Праваахоўнікі затрымалі 46 чалавек па справе аб тэракце, у тым ліку жанчыну, якую падазраюць у выкананні выбуху.

### Францыя на фоне крызісу з мігрантамі прыгразіла Італіі наступствамі



Міністр замежных спраў Францыі Катрын Калона папярэдзіла Італію аб наступствах пасля адмовы прымаць судна з мігрантамі Ocean Viking. Аб гэтым яна заявіла ў інтэрв'ю газеце Parisien у адказ на пытанне аб будучыні адносін дзвюх краін. Ocean Viking належыць асацыяцыі SOS Mediterranee, якая займаецца выратаваннем мігрантаў, якія спрабуюць пераплысці Міжземнае мора і трапіць у Еўропу. На мінулым тыдні судну адмовілі ў заходзе ў адзін з італьянскіх партоў, пасля чаго яму прыйшлося адысці ад берагоў Сіцыліі. «Будуць наступствы, калі Італія стане ўпарціцца ў гэтых адносінах. Са свайго боку мы прыпынілі механізм перасялення мігрантаў з Італіі і ўзмацнілі кантроль на межах паміж Францыяй і Італіяй. Трэба нагадаць Рыму аб яго абавязку прыяўляць чалавечнасць. І спадзяваўца, што ён зразумее гэтае пасланне», — растлумачыла дыпламат.

# У новае жыллё — з падарункамі

## Удаве Героя Беларусі Уладзіміра Карвата дапамаглі перасяліцца ў новую кватэру

**У Брэсце мясцовыя ўлады дапамаглі ўдаве першага Героя Беларусі Уладзіміра Карвата пераехаць у новую кватэру. З наваселлем Ніну Карват павіншаваў старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА, перадае карэспандэнт БелТА.**



Фота БелТА.

Падпалкоўнік авіяцыі Уладзімір Карват загінуў 23 мая 1996 года. Да апошніх секунд свайго жыцця ён рабіў усё магчымае, каб адвесці самалёт, які пацярпеў крушэнне, ад аграгарадка Арабаўшчына ў Баранавіцкім раёне. За праяўленую мужнасць пры выкананні воінскага абавязку пілоту пасмяротна было прысвоена званне Героя Беларусі. Апошнія 24 гады яго ўдава Ніна Карват жыла ў доме на вуліцы Маскоўскай у Брэсце. Яна звярнулася да Юрыя Шулейкі з просьбай пасадзейнічаць у змене месца жыхарства ў сувязі са станам здароўя. Службы абласнога і гарадскога выканкамаў вывучылі рынак жылля і прапанавалі варыянт на вуліцы Савецкай Канстытуцыі. Жанчыне аказалі садзейнічанне ў продажы старой кватэры і набыцці новай.

«Мая старая кватэра знаходзілася на апошнім, пятым, паверсе. Акрамя таго, па прыпынку ісці недзе адзін кіламетр. Было цяжкавата дабірацца дадому. Звярнулася па дапамогу ў аблвыканкам. Усё вырашылася добра. Я вельмі ўдзячная ўсім за дапамогу: столькі я атрымала», — расказвае Ніна Карват.

З наваселлем яе прыехаў павіншаваць старшыня аблвыканкама Юрый Шулейка. Ён выказаў Ніне Карват словы падтрымкі і пацікавіўся яе жыццём. Госці, натуральна, прыйшлі не з пустымі рукамі. «Прыгожая хата, побач прыпынак. Я яшчэ тут абвыкаю. Выбірала кватэру ў зацішным кутку, каб вокны выходзілі ў двор і было спакайней», — адзначыла Ніна Кірылаўна.

Мінскі міжнародны кінафестываль ЛІСТАПАД

# «ЗДАРОВЫ ЧАЛАВЕК» ПЕРАМАГАЕ...

## Стужка Пятра Тадароўскага атрымала «Золата «Лістапада»

**Па традыцыі ў кінатэатры «Масква» прайшла цырымонія закрыцця XXVIII Мінскага міжнароднага фестывалю «Лістапад». Ганаровымі гасцямі мерапрыемства, якое адбылося ўвечары 11 кастрычніка, сталі ўдзельнікі форуму, культурныя дзеячы і аматары кінамастацтва. Акрамя імёнаў пераможцаў фестывалю ў розных намінацыях, раскрылася галоўная інтрыга ўсяго «лістападнага» тыдня — абвясцілі ўладальніка Гран-пры.**











Фота Лізаветы ГОЛАД.

Падчас цырымоніі **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** адзначыў, што конкурс засведчыў сапраўдны каштоўнасці кінематаграфіі:

— Тыдзень «Лістапада» дэманстраваў Беларусі і краінам, якія прыехалі і прадставілі свае работы ў сферы кінамастацтва, сапраўдныя каштоўнасці кінематаграфіі. Асаблівыя словы ўдзячнасці хачу выказаць нашым сябрам, якія прыехалі з суседніх краін, найперш з Расіі. Яны бралі ўдзел ва ўсіх конкурсных намінацыях. Дзякуй гледачам за тое, што яны шчыра, з увагай ацэньвалі ўсе кінатворы, якія дэманстраваліся на фестывалі. Я са шкадаваннем кажу: «Да сустрэчы, кінафестываль-XXVIII, і мы чакаем усіх на XXIX Міжнародным «Лістападзе» ў наступным годзе», — падсумаваў Ігар Петрышэнка.

Адразу некалькі ганаровых узнагарод атрымаў фільм «Здаровы чалавек» расійскага рэжысёра Пятра Тадароўскага. Стужцы прысудзілі спецыяльны прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За гуманізм і духоўнасць у кіно». Прадстаўнік фільма Ганна Лявонцьева, атрымліваючы на сцэне ўзнагароду, падзякавала Прэзідэнту краіны за ацэнку творчай работы. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр фільма Пётр Тадароўскі-малодшы даслаў відэазварот, у якім падзякаваў за такую высокую ўзнагароду. Фільм «Здаровы чалавек» удзельнічаў у асноўным конкурсе ігравога кіно «Лістапада». Прэм'ера фільма падчас кінафестывалю адбылася 5 лістапада. Галоўныя ролі ў карціне выканалі Мікіта Яфрэмаў, Ірына Старшанбаум, Яўген Ткачук.

Менавіта стужка Пятра Тадароўскага перамагла ў конкурсе — «Здаровы чалавек» атрымаў Гран-пры «Золата «Лістапада»:

— Самае галоўнае, што фільм знайшоў водгук у гледачоў. Падчас яго паказу на кінафестывалі ў Мінску нехта плакаў, нехта смяяўся, а значыць, карціна не пакінула абыякавымі, — адзначыла прадстаўнік фільма. — Узнагародамі і дыпломамі была адзначана вялікая колькасць стужак, прадэманстраваных падчас конкурснага тыдня. Так, прыз за найлепшую жаночую ролю атрымала Святлана Чуйкіна, якая выканала галоўную ролю ў фільме «Плакаць нельга». Прызам за найлепшую мужчынскую ролю ўдастоілі Алега Чугунова за работу ў карціне «Здаровы чалавек».

Прыз сімпатый за найлепшы ігравы фільм атрымала кітайская стужка «Сястра» рэжысёра Жасінь Інь.

Гран-пры за найлепшы дакументальны фільм узяла работа «Агонь» расійскага рэжысёра Ганны Янкоўскай.

Найлепшым фільмам конкурсу анімацыйных фільмаў стала стужка Адама Сіяра, Габрыэль Сельнэ і Хлоі Фар «Бывай, Жэром!» (Францыя). А найлепшым анімацыйным фільмам для дзяцей стала работа рэжысёра Уры Лотана «Чорная горка» (Ізраіль — Вялікабрытанія).

Прызам за найлепшы фільм конкурсу імя кінарэжысёра Віктара Турава ўзнагародзілі фільм Арсенія Кайдацкага і Юліі Сергінай «Уральскае дэрбі». Таксама падчас цырымоніі закрыцця было ўручана некалькі спецыяльных прызоў. Так, айчынная стужка «Класікі і шахматы» Наталлі Касцючэнкі атрымала спецыяльны прыз Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта за ўвасабленне духоўнасці ў мастацтве.

Спецыяльны прыз СНД «Кіно без межаў» за развіццё культурнага супрацоўніцтва і ўмацаванне сяброўства паміж народамі ўручаны творчаму калектыву ігравога кыргызскага фільма «Шамбала» (рэжысёр Артыкпай Суюндукаў).

Прызам прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «МІР» у Беларусі «Мова кіно — мова дружбы» ўзнагароджаны фільм Акрама Шахназарава «101 рэйс» (Узбекістан).

Спецыяльны прыз журы за найлепшы фільм фестывалю прысудзілі сербскай стужцы «Прэбілаўцы — там нават у камянёў ёсць шнары» (рэжысёр Саня Драгічэвіч Бабіч).

Фінальным акордам цырымоніі закрыцця XXVIII «Лістапада» стала выступленне ансамбля «Песняры»: выканаўцы падарылі гасцям песню «Золата «Лістапада», якая была напісана спецыяльна для фестывалю.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Надвор'е

# Калі мокры снег і дождж, а потым падмарозіць — атрымліваецца першая галалёдзіца

## Гэта ідзе холад з поўначы Еўропы

**Пагрэлі нас вятры з Атлантыкі. Так пагрэлі, што амаль цэлую дэкаду тэмпературны фон быў на 3—10 градусаў вышэйшы за кліматычную норму. Такая тэмпература больш адпавядае пачатку кастрычніка. Але не ўсё кату масленіца — завяршаецца першая палова лістапада. А таму істотнае пахаладанне, снег і галалёдзіца чакаюцца ў нашай краіне на гэтым тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, трэці тыдзень лістапада адзначыцца карэнным пераломам у атмасферы. Паветраныя патокі памяняюць свой напрамак, і на тэрыторыю нашай краіны паступяць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы з поўначы Еўропы. Тэмпературны фон панізіцца, а ападкі пяройдуць у змешаную фазу (мокры снег, дождж), дзе-нідзе нават зможа сфарміравацца першае снежнае покрыва.

У аўторак чакаецца без істотных ападкаў. Днём месцамі, а па паўночным усходзе краіны ў многіх раёнах будуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца туман. Максімальная тэмпература паветра чакаецца ад плюс 1 градуса да 7 цяпла. Па паўднёвым захадзе Беларусі сіноптыкі абяцаюць плюс 8—10 градусаў.

Холад з поўначы кантынента дасягне нас ужо ў сераду. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе мінус 3 — плюс 4 градусы.

Паводле папярэдняга прагнозу, у другой палове тыдня на тэрыторыю краіны прарвуцца халодныя паветраныя масы арктычнага паходжання. Усталюецца сапраўды халоднае надвор'е. Начныя маразы стануць больш адчувальнымі, пры гэтым і дзённыя тэмпературы будуць з плюсам не ўсюды.

У чацвер месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе мінус 1—7 градусаў, днём — ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла. Да канца тыдня надвор'е стане яшчэ больш жорсткім. У пятніцу месцамі, у асноўным па ўсходзе краіны, чакаецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 9 градусаў, пры праясненнях — да мінус 11 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень будзе ад мінус 6 да плюс 1 градуса. Вось так. Нават на выхадныя чакаецца мароз ноччу да мінус 10—11 градусаў. А гэта яшчэ не зіма.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дзяржаўнага дзеяча, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР сёмага склікання, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання СЛАБАДЫ Аляксандра Іванавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны смерці Аляксандра Сяргеевіча МАТУСЕВІЧА.**

**Выказваем спачуванне родным і блізкім А. С. Матусевіча ў сувязі з напаткаўшым іх горам і падзяляем смутак.**



# «АДНОСІНЫ З БЕЛАРУССЮ ЗАСЛУГОЎВАЮЦЬ САМАГА ВЫСОКАГА ДАВЕРУ»

## «Узаемадзеянне прыносіць вялікую радасць»

***— Спадар пасол, гэты год асабліва, нашы краіны адзначылі знамянальную дату — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Бразіліяй. Чаго ўдалося дасягнуць за мінулы час?***

— Я ацэньваю супрацоўніцтва нашых краін на працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў як вельмі станоўчае, улічваючы наяўнасць як у Бразіліа, так і тут, у Мінску, дыпламатычных прадстаўніцтваў. Яны, дарэчы, з'явіліся пасля 2010-га дзякуючы дамоўленасці Аляксандра Лукашэнкі і Лулы да Сілва (які ў той час быў прэзідэнтам Бразіліі і нядаўна зноў выйграў выбары кіраўніка дзяржавы і хутка распачне свой трэці тэрмін на гэтай пасадзе. — **М. Л.**). Пасольствы імкнуцца пашырыць і паглыбіць супрацоўніцтва і ўзаемаразуменне паміж нашымі краінамі. Для Бразіліі ўзаемадзеянне з Беларуссю прыносіць вялікую радасць, мы прыкладаем максімальныя намаганні для таго, каб дыялог паміж нашымі краінамі быў больш цесным і ўзаемавыгадным. За апошнія некалькі гадоў удалося істотна ўмацаваць сувязі ў такіх важных сферах, як палітычная, эканамічная і культурная. Але найважнейшае тое, што нават у часы цяжкасцяў абедзве краіны накіраваны на пошук сумесных рашэнняў для іх пераадолення. Вы павінны ведаць, што Бразілія — гэта тая краіна, якая заўсёды гатовая працягнуць руку дапамогі Беларусі. Я перакананы, што адносіны з вашай краінай заслугоўваюць самага высокага даверу. Тут сур'ёзныя прадпрымальнікі, высокі ўзровень кваліфікацыі спецыялістаў. Гэта вялікі, надзейны партнёр, і мы тое цэнім.

***— Наколькі паспяхова на фоне даволі няпростай міжнароднай абстаноўкі, звязанай з санкцыйнымі абмежаваннямі, эпідэмічнай сітуацыяй, развіваецца сёлета беларуска-бразільскае супрацоўніцтва? Як вы ахарактарызуеце дынаміку двухбаковага ўзаемадзеяння на дадзеным этапе? Чым цікавая Бразіліі наша краіна?***

— У двухбаковых адносінах пераважаюць камерцыйныя, гандлёва-эканамічныя пытанні. Цяпер я аддаю асаблівую ўвагу тэме ўгнаенняў. Бразілія з'яўляецца буйным імпарцёрам калію з Беларусі, гэты прадукт адыграе ключавую ролю ў зладжанай рабоце бразільскага аграбізнесу. Сёння шмат гавораць аб глабальнай харчовай бяспецы. У сусветнай сельскагаспадарчай вытворчасці ўдзельнічаюць розныя краіны, але без свабоднага гандлю і без угнаенняў сістэма дрэнна працуе.

Яшчэ адна важная тэма — авіяцыя. Бразілія традыцыйна з'яўляецца экспарцёрам пасажырскіх самалётаў для кампаніі «Белавія». І мы разлічваем на захаванне нашай прысутнасці ў Беларусі ў будучыні. Ёсць таксама шмат магчымасцяў для пашырэння гандлю. Новыя прадукты і паслугі могуць быць з вялікай цікавасцю сустрэты на мясцовым рынку. Я маю на ўвазе, у прыватнасці, харчовы сектар і пастаўкі кавы высокай якасці, садавіны, алейных культур. Бачу таксама вялікія магчымасці на рынку тэкстылю, фармацэўтычнай прадукцыі, запчастак, металургіі і інфармацыйных тэхналогій.

## «Свет не павінен быць аднапалярным»

***— У Бразіліі актыўна развіваецца аграпрамысловы комплекс, па шэрагу пазіцый краіна — у ліку вядучых сусветных экспарцёраў. Як вырашаюцца пытанні, звязаныя з пастаўкамі беларускіх угнаенняў, сельскагаспадарчай тэхнікі на бразільскі рынак?***

— Для Бразіліі заўжды было надзвычай важна мець уласную незалежную знешнюю палітыку. Мы імкнёмся будаваць добрыя ўзаемаадносіны з усімі краінамі і паважаем пазіцыю наконт таго, што свет не павінен быць аднапалярным. Мусяць быць розныя цэнтры ўплыву для раўнавагі міжнародных адносін. Бразілія ніколі не працуе супраць кагосьці, заўсёды працуе толькі на агульную карысць — за развіццё дыялогу, умацаванне міру. Санкцыі контрпрадукцыйныя, яны раздзяляюць краіны. Цяпер як ніколі так патрэбны дыялог. Не варта забываць аб тым, што дыпламатычныя адносіны павінны быць пабудаваны на дыялогу. Мэта стварэння такіх буйных аб'яднанняў, як ЕС, МЕРКАСУР, — адзінства, а не раз'яднанне.

Абмежаванні, якія нам навязваюць, наносяць урон прадпрыемствам як у Бразіліі, так і ў Беларусі. Часта буйныя дзяржавы забываюць аб наступствах санкцый для астатніх краін. Абмежаванні закранаюць глабальныя тэмы, сярод якіх сусветная бяспека, у тым ліку харчовая. Парушаецца эканамічная стабільнасць краін, павялічваюцца цэны.

Санкцыі не толькі стрымліваюць гандлёвы паток, а і перамяшчэнне людзей паміж нашымі краінамі. У нас ёсць магчымасць арганізоўваць прамыя рэйсы паміж Мінскам і Бразіліа. Аднак з-за санкцый кошт пералётаў узляцеў настолькі, што стаў недаступным для большасці людзей.

Бразілія, як і Беларусь, спрабуе абысці санкцыі, якія прынятыя ў аднабаковым парадку і негатыўным чынам адбіваюцца на нашых краінах. Можна сказаць, што дадзенае пытанне вырашаецца, але, на жаль, не так хутка, як хацелася б. Мы шукаем як фінансавыя, так і лагістычныя альтэрнатывы. Бразільскі ўрад прыклаў вялікія намаганні, каб скаардынаваць дзеянні сваёй дыпламатычнай службы не толькі ў Мінску, але і ў іншых ключавых краінах для вырашэння такога пытання. Я кажу пра вядомую «дыпламатыю ўгнаенняў».

Лічу, што Беларусь магла б таксама выкарыстаць свой значны патэнцыял у сектары вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі для павелічэння экспарту ў Бразілію. Наш рынак вельмі вялікі, але ў той жа час надзвычай канкурэнтны. Таму важна арганізоўваць гандлёвыя прадстаўніцтвы і ўдзельнічаць у спецыялізаваных кірмашах у Бразіліі, каб належным чынам прадставіць гэтыя машыны патэнцыяльным пакупнікам.

***— Якія напрамкі двухбаковага ўзаемадзеяння можна вызначыць як стратэгічныя?***

— Гістарычна паміж нашымі краінамі склалася добрае супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай і культурнай галінах. Але я лічу, што існуе мноства магчымасцяў для паглыблення супрацоўніцтва ў галінах, пра якія я ўжо сказаў, а таксама ў іншых — такіх, як спорт, адукацыя і тэхналагічны сектар.




## «Ёсць агульная зацікаўленасць у сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў»

***— Аляксандр Лукашэнка ў сваім віншаванні Лулу да Сілва з перавыбраннем Прэзідэнтам Бразіліі запрасіў яго наведаць Беларусь у зручны час з візітам. «Нам ёсць пра што пагаварыць як старым добрым сябрам, што абмеркаваць з улікам змен, якія адбыліся за апошнія дванаццаць гадоў», — адзначыў беларускі лідар. Калі магчымы такі візіт?***

— Візіты на найвышэйшым узроўні заўжды вельмі жаданыя і эфектыўныя, яны заўсёды надаюць заўважны імпульс развіццю двухбаковых адносін, дазваляюць вывесці іх на новы ўзровень. Працяг дыялогу на ўзроўні першых асоб дзяржаў быў бы вельмі важным для паглыблення, пашырэння сувязяў. Для гэтага створаны ўсе перадумовы і, паверце, існуе агульная зацікаўленасць у такой сустрэчы. Пакуль цяжка нешта казаць наконт канкрэтных тэрмінаў, спадзяюся, што гэта найбліжэйшая перспектыва.

Перакананы, што для Бразіліі будзе дабратворным вяртанне Лулы да Сілва на пасаду кіраўніка дзяржавы. Гэта ўжо трэці яго прэзідэнцкі тэрмін. Гэта той палітык, які ў свой час атрымаў максімальную колькасць мандатаў у Бразіліі. Прэзідэнт Лула — сімвал барацьбы простых бразільцаў за свае правы. Думаю, ім ёсць пра што пагаварыць з Аляксандрам Лукашэнкам. У абодвух — каласальны палітычны вопыт.

***— Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей на сустрэчы на палях сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку з міністрам замежных спраў Бразіліі Карлусам Альберту Франку Франса абмеркавалі ў тым ліку пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях. Як развіваецца супрацоўніцтва ў згаданай сферы, у тым ліку, як магчымая перспектыва, на пляцоўцы БРІКС?***

— Нашы краіны маюць станоўчы досвед сумеснай работы ў міжнародных арганізацыях. Беларусь падтрымлівае заяўку Бразіліі на атрыманне месца пастаяннага члена ў пашыраным Савеце Бяспекі ААН. Таксама ваша краіна часта падтрымлівае бразільскіх кандыдатаў на пасады ў міжнародных арганізацыях. Бразілія вельмі ўдзячная за падтрымку, якая была нам аказана.

БРІКС з'яўляецца важным аб'яднаннем для нашай краіны. У яго рамках створаны механізм пашыранага дыялогу з іншымі дзяржавамі, якія развіваюцца. Мы лічым пазітыўным удзел Беларусі ў гэтым механізме.

## «У вашай краіне я знайшоў сапраўдны скарб»

***— Пасольства актыўна падтрымлівае і прасоўвае праекты, звязаныя з традыцыйнай бразільскай культурай, партугальскай мовай. Як яны ўспрымаюцца беларусамі, наколькі паспяхова праходзіць культурны абмен паміж нашымі народамі?***

— Калі я прыехаў, я сустрэў на вуліцах Мінска бразільскую прысутнасць у стрыт-арце, работах нашых мастакоў, прадстаўленых па ўсім горадзе, асабліва ў раёне вуліцы Кастрычніцкай. Многія з іх былі створаны ў рамках фестываля Vulica Brasil.

У Беларусі праваднікамі ў бразільскую культуру першапачаткова былі музыка і літаратура — творы такіх пісьменнікаў, як Жоржы Амаду, Паўла Каэльа, а пасля тэлесерыялы, такія як «Рабыня Ізаўра», якія паказвалі яшчэ ў савецкі перыяд. Пазней сталі папулярнымі іншыя серыялы, такія як «Клон». Гэтая прысутнасць дае нам упэўненасць у тым, што ёсць дабратворная глеба для працягу сумеснай работы.

Калі вы вывучаеце новую мову, вы адчыняеце дзверы ў новы свет з пункту гледжання сяброўства, культуры і бізнесу. Партугальская — адна з самых распаўсюджаных моў у свеце. Я быў рады даведацца, што ва ўніверсітэтах Беларусі ёсць студэнты, якія вывучаюць партугальскую мову. Ідэя заключаецца ў тым, каб у найбліжэйшыя гады павялічыць колькасць студэнтаў, якія вывучаюць партугальскую ў Беларусі, і бразільцаў, якія вывучаюць рускую і, магчыма, беларускую мовы ў Бразіліі.

***— Як развіваецца ўзаемадзеянне ў сферах адукацыі, турызму?***

— З 2019 года дзейнічае пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі паміж Бразіліяй і Беларуссю. Дагавор з'яўляецца важным крокам, бо дазваляе паглыбіць супрацоўніцтва паміж урадамі і ўніверсітэтамі. Ідэя ў тым, каб заахвочваць абмен ведамі, а таксама студэнтамі і выкладчыкамі праз дагаворы, стыпендыі і даследаванні.

У сферы турызму важнай вяхой стала прыняцце нашымі краінамі ў 2016 годзе рашэння аб бязвізавым рэжыме. Так што на практыцы любы беларус можа паехаць у Бразілію без візы і аплаты якіх-небудзь збораў.

***— Якія вашы ўражанні ад Беларусі, дзе ўдалося пабываць у нашай краіне, што паспыталі з нацыянальных страў?***

— Уражанні самыя лепшыя. Дагэтуль я, на жаль, не быў у вашай цудоўнай краіне, і для мяне вялікае задавальненне прадстаўляць Бразілію ў Беларусі, дзе я сустрэў вельмі гасцінных людзей і станоўчы вобраз Бразіліі. Гэта дае мне вялікі прастор для работы. Я бачу, што Беларусь за апошнія 30 гадоў дасягнула вельмі шмат у розных галінах, забяспечыўшы высокую якасць жыцця для свайго насельніцтва. Не стамляюся паўтараць, што ў вашай краіне я знайшоў сапраўдны скарб. Мінск — арганізаваны горад, зялёны, чысты, бяспечны, прыгожы. Самае галоўнае — тут жывуць цудоўныя людзі, якія з радасцю дапамагаюць іншаземцам. Тут адчуваеш сябе доўгачаканым і жаданым госцем. Я магу параўноўваць, паколькі працаваў у пасольствах шэрагу краін у розных кутках планеты. Тое, як паводзяць сябе беларусы, гэта нешта вельмі незвычайнае ў цяперашнім рацыянальным і даволі жорсткім свеце. Здзіўляюць шчырасць, дабрыня, адкрытасць беларусаў. Я атрымліваю вялікую радасць ад зносін і спадзяюся з такім жа пачуццём працаваць надалей. Самае важнае — пазітыўнае ўспрыманне, разуменне ўзаемнасці, блізкасці. Гэта як гаручае для таго, каб усё рухалася, каб быў поспех ва ўзаемадзеянні. Асабліва тое важна для народаў, якія геаграфічна такія далёкія адзін ад аднаго. Я бачу, што Бразілія выклікае станоўчыя эмоцыі ў вашай краіне. І гэта натхняе.

Спадзяюся і надалей адкрываць для сябе Беларусь. З традыцыйных страў я ўжо паспытаў дранікі і цудоўныя беларускія сыры. А яшчэ я стаў пастаянным наведвальнікам Камароўскага рынку ў Мінску.

***— На адкрыцці першага Фестывалю лацінаамерыканскай культуры вы казалі пра агульныя рысы беларускага і бразільскага народаў. У чым яны выяўляюцца?***

— Перш за ўсё, нягледзячы на адлегласць, у нас узнікае пачуццё ўзаемнай сімпатыі. Калі я прыехаў у Мінск, я ўбачыў станоўчы вобраз Бразіліі. Гэта вынік таго, што трансліруецца праз сродкі масавай інфармацыі і кінафільмы. Беларускі народ не саступае бразільскаму ў сваёй міралюбнасці і шчырасці. Беларусы цэняць жыццё, сяброўства і смачную ежу. Я захапляюся высокім узроўнем культуры, ветлівым і гасцінным характарам беларускага народа.

***— Сёння ў Бразіліі вялікае свята — Дзень абвяшчэння рэспублікі. Падчас святкавання згадваюць і знакавую дату — 200-годдзе незалежнасці, якое сёлета адзначыла найбуйнейшая лацінаамерыканская краіна. Ад усяго сэрца віншуем і зычым міру, радасці і працвітання!***

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ФІНАЛЬНЫ АГРАРНЫ АКОРД

**У Віцебску падвялі святочную мяжу ўборачнай кампаніі на фінальным этапе абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Сёлета паўночны рэгіён скарыў новую вяршыню — унёс у рэспубліканскі каравай 1 мільён 115 тысяч тон збожжа. Найлепшых перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці віталі ў Віцебскай абласной філармоніі.**



Фота БелТА.

Гэтае жніво для віцебскіх аграрыяў стала рэкордным не толькі ў маштабах вобласці і краіны, але і ў асабістых заліках: адзіныя на Віцебшчыне камбайнеры філіяла «Задняпроўскі» Аршанскага раёна Аляксандр Камароў і Аляксандр Склязноў сабралі 5 695 тон залатога палёў. Тысячны намалот збожжа перасягнулі 198 экіпажаў камбайнераў вобласці, двухтысячны — 27, а трохтысячны — чатыры.

Сярод гаспадарак паўночнага рэгіёна, якія дасягнулі найлепшых вынікаў па ўраджайнасці збожжавых, аказаліся «Ларынаўка» Аршанскага раёна, «Хацілы-Агра» Пастаўскага раёна, Талачынскі кансервавы завод, філіял СГП «Мазалавагаз» УП «Віцебскаблгаз» Віцебскага раёна, Віцебская бройлерная птушкафабрыка. Найбольшую ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур атрымалі Віцебскі раён — звыш 41 цэнтнера з гектара, Аршанскі раён — амаль 41 цэнтнер з гектара, Верхнядзвінскі раён — 35,5 цэнтнера з гектара.

— Пасяўная і ўборачная — гарачая пара, сур'ёзны экзамен для аграрыяў усёй краіны, па выніках якога Віцебшчына дэманструе добры вынік. Сёлета намалочана больш за мільён тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 31 ц/га, што значна вышэй за паказчыкі папярэдняга года. Гэта заслуга ўсіх аграрыяў, жывёлаводаў, механізатараў, камбайнераў, кіроўцаў, кіраўнікоў усіх узроўняў: ад сельгаспрадпрыемстваў да раённых і абласных структур, перапрацоўчых прадпрыемстваў Віцебскай вобласці. Хацелася б, каб Віцебская вобласць заўсёды дэманстравала такія вынікі, як сёлета. Дзякуй вам за цярпенне, вытрымку і працу, якая часам доўжылася ад відна да відна, — адзначыў у віншавальным слове **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА.** Ігар Пятровіч таксама зачытаў на святочным мерапрыемстве прывітальны адрас Прэзідэнта Беларусі і ўручыў кошык кветак ад Аляксандра Лукашэнкі.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** адзначыў, што сёлета паспрыяла



не толькі надвор'е, але і стаўка на азімыя, а таксама выкананне вытворчых тэхналогій, тэрмінаў сяўбы, унясення ўгнаенняў і, вядома, працоўная дысцыпліна. Губернатар падкрэсліў, што апошнія гады сталі сапраўдный праверкай для сусветных эканамічных адносін. «Мы разумеем, наколькі нетрывалым можа быць мір і як хутка можна страціць тое, што будавалася стагоддзямі. Працаваць па-старому ўжо не атрымаецца. Цяпер непарушным пастулатам павінны быць якасць і тэмпы, патрэбна сістэмная ўпарадкаваная работа», — сказаў Аляксандр Міхайлавіч. Кіраўнік вобласці падзякаваў аграрыям за цяжкую штодзённую працу дзеля краіны, падкрэсліўшы, што сваімі высокімі дасягненнямі яны ўзнімаюць аўтарытэт аграрнай галіны, і ўручыў заслужаныя ўзнагароды.

**Прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Пётр ПАРХОМЧЫК** таксама далучыўся да віншавання аграрыяў: «Па ўраджайнасці бульбы Віцебшчына апярэдзіла ўсе рэгіёны краіны, па ўраджайнасці цукровых буракоў апярэдзіла Міншчыну, але крыху недацягнула да Гродзенскай вобласці, вялікая ўраджайнасць і па агародніне. Так што Віцебская вобласць не толькі гарантавала харчовую бяспеку свайму рэгіёну, але і ў цэлым нашай краіне». Пётр Аляксандравіч таксама ўручыў Аляксандру Субоціну сертыфікат на камбайн КЗС-1218, які будзе накіраваны ў адну з гаспадарак паўночнага рэгіёна.

Прывітальныя словы віцебскім працаўнікам вёскі даслалі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля



Качанава і Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка.

На тое, што аграрыі ўсёй краіны гарантавалі харчовую бяспеку беларусам, у віншавальным слове звярнуў увагу **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО:** «Узровень самазабяспечанасці малаком склаў 263 працэнты, мясам — 134 працэнты, яйкам — 128 працэнтаў, бульбай і агароднінай — звыш 100 працэнтаў. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што мы сталі экспартаарыентаванай краінай. За дзевяць месяцаў нам удалося экспартаваць прадукцыю на шэсць мільярдаў долараў, гэта 126 працэнтаў росту да ўзроўню мінулага года. Важную ролю ў гэтым адыграла Віцебская вобласць — практычна 400 мільёнаў з такім жа тэмпам росту. Такім чынам краіна выйдзе і на рэкордны ўзровень экспарту. Мы адназначна перасягнем сёлета суму ў восем мільярдаў долараў і ў чарговы раз праявім сябе на міжнародным рынку».

Ганаровыя госці свята ўсклалі кветкі да воінскага мемарыяла на Успенскай гары і азнаёміліся з падворкамі прадпрыемстваў Віцебшчыны.

Прагучаў фінальны аграрны акорд сезона-2022, а працаўнікі вёсак Віцебшчыны ўжо рыхтуюцца да наступнага жніва, каб пакінуць у сельскагаспадарчым летапісе краіны яшчэ больш яркі след.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# АГРААЛІМП НА БЕРАЗЕ ІПУЦІ

**Каравай аграрыяў Гомельшчыны сёлета пацяжэў на 50 тысяч тон у параўнанні з леташнім: з улікам кукурузы намалочана 1,1 мільёна тон. Практычна поўнасцю ўбраны ўраджай з палёў. Вынікі сельскагаспадарчага сезона паўднёвага ўсходу Беларусі падвялі на рэгіянальным фестывалі-кірмашы «Дажынкі-2022» у горадзе на Іпуці — Добрушы.**

## ПАДАРУНКІ ДА СВЯТА

Па традыцыі адным з галоўных атрыбутаў свята стала маштабная выстаўка сельгастэхнікі. Размясціліся на ёй і рарытэты, якія выходзілі на раллю паўстагоддзя таму, і суперсучасныя волаты палёў. Тут можна было ўбачыць і падарункі да «Дажынак» гаспадаркам вобласці ад «Гомсельмаша». Сертыфікаты на новы збожжаўборачны камбайн перададзены КСУП «Цяплічнае» Гомельскага раёна, а на касілку-плюшчылку — КСУП «Беразнянскі» Калінкавіцкага раёна.

На выставе бляскам салонаў захапляла і шарэнга навенькіх «пазадарожнікаў». Легкавыя машыны — падарункі раёнам да «Дажынак» і выпускнікам губернатарскай «Школы маладога кіраўніка».



## ВЫНІКІ І НОВЫЯ ПЛАНЫ

Адпрацавала больш чым тысяча экіпажаў збожжаўборачных камбайнаў, звыш 290 экіпажаў сталі «тысячнікамі», на рахунку 18 тандэмаў — больш за дзве тысячы тон намалочанага збожжа новага ўраджаю. Словы шчырай падзякі героям сёлетняй уборачнай кампаніі на Гомельшчыне са сцэны рэгіянальнага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2022» адрасаваў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

Кіраўнік рэгіёна таксама даў самую высокую ацэнку прафесіяналізму механізатараў, жывёлаводаў, прадстаўнікоў усіх аграрных прафесій, праца якіх прынесла поспехі сёлета на Гомельшчыне.

— Мы выраслі па ўзроўні прыбытку, рэнтабельнасць мае станоўчую дынаміку, вырасла выручка на аднаго працаўніка. Атрымалася пераарыентаваць рынкі збыту з Еўропы, Украіны на Расійскую Федэрацыю і Кітай. Эканамічныя паказчыкі аграпрамысловага комплексу на высокім узроўні. Сёння ў рэгіёне ў рамках структуры пасяўных плошчаў, развіцця жывёлагадоўлі пабудавана дарожная карта, і вектар развіцця рухаецца сваім ходам, таму вынікі будуць радаваць. Хацелася б падзякаваць Прэзідэнту, ураду за падтрымку аграрыяў. Сёлета ў рэгіёне пабудавана пяць новых сельскагаспадарчых комплексаў. Па даручэнні Прэзідэнта, пры падтрымцы ўрада закладзена 11 новых малочнатаварных комплексаў, якія будуць уведзены ў наступным годзе. Цяпер прыступаем да будаўніцтва свінакомплексу, — падкрэсліў старшыня Гомельскага аблвыканкама.

На станоўчыя вынікі сёлетняга сельскагаспадарчага года на Гомельшчыне звярнуў увагу ганаровы госць фестывалю — **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ.** Па словах віцэ-прэм'ера, рэгіён у гэтым сезоне вызначыўся экспартам сельгаспрадукцыі — 130 % да ўзроўню мінулага года.

— Геаграфія паставак шырокая, якасць прадукцыі палепшылася, асартыментны пералік дастаткова разнастайны, — звярнуў увагу Леанід Заяц. — Так, няпростыя гаспадарчыя ўмовы, чарнобыльская аварыя. Але, да гонару кадраў Гомельскай вобласці, яны выйшлі на дастаткова няздрэнныя паказчыкі ў галіне земляробства. Упэўнены, што ў Гомельскай вобласці мабілізуюць усе рэзервы, і ў наступным годзе вынікі будуць яшчэ вышэйшыя, — падкрэсліў ён.

**Кіраўнік спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Юрый НАЗАРАЎ** падкрэсліў, што ў Гомельшчыны ёсць усё неабходнае, каб і надалей сельская гаспадарка рэгіёна толькі мацнела і развівалася. Ён зачытаў традыцыйны прывітальны адрас ад кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з нагоды завяршэння ўборачнай кампаніі на Гомельшчыне.



А ў мясцовым Доме культуры ўзнагароды аграрыям уручаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.

## НАЙЛЕПШЫЯ НА ЖНІВЕ

Ганаровыя граматы, сертыфікаты і каштоўныя падарункі на святочнай сцэне ў Добрушы атрымалі пераможцы абласнога спаборніцтва за дасягненне найвышэйшых паказчыкаў у сельскай гаспадарцы.

Чэмпіёнам па вытворчасці збожжа на Гомельшчыне сярод сельскагаспадарчых арганізацый прызнаны «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна. Званне лідара сярод старшых камбайнераў заваяваў супрацоўнік гаспадаркі «Маложынскі» Брагінскага раёна Андрэй Гуд. Сярод маладзёжных экіпажаў першае месца ў Міхаіла Бабарыкі з «Тураўшчыны» Жыткавіцкага раёна. Сярод кіроўцаў на перавозцы збожжа першы Дзмітрый Жмурко з «Калінінскага», што на Добрушчыне. Сярод маладых кіроўцаў дыплом пераможцы для сваёй гаспадаркі «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна заваяваў Аляксандр Карпенка.

Найлепшымі вынікамі ў нарыхтоўцы травяных кармоў сёлета вызначаны Мазырскі раён. Гэты ж рэгіён абсалютны лідар у дасягненні найвышэйшых паказчыкаў па вытворчасці малака, свініны, ялавічыны, а таксама па ўзнаўленні статка сельскагаспадарчых жывёл.



## НОВАЯ ТРАДЫЦЫЯ

На абласным фестывалі-кірмашы была закладзена новая традыцыя «Дажынак» на Гомельшчыне. Адбылася ўрачыстая перадача тытула «Сталіца «Дажынак» ад Добруша — Акцябрскаму. Менавіта гэтаму раённаму цэнтру выпаў гонар у 2023 годзе стаць галоўнай святочнай пляцоўкай ушанавання аграрыяў рэгіёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

## Сведения о результатах проведения рекламной игры

# «ВЫИГРЫВАЙ С ONLINER 29»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «ЭлкоТелеком», юридический адрес: 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22а, офис 41, комната 2, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190751103, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 08.09.2006.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 01.10.2022 по 26.12.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4236, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 15.09.2022.

5. Количество участников рекламной игры – 1031 чел.

6. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 4654 (четыре тысячи шестьсот пятьдесят четыре) белорусских рубля 44 (сорок четыре) копейки. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

7. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Козинец И.О. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 2 | Генеральчик Е.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 3 | Пытляк А.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 4 | Брундуков В.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 5 | Михалевич О.М. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 6 | Шемпель В.Н. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 7 | Можаев Э.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 8 | Кононович В.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 9 | Дуброва Н.Н. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Turquoise Cyan (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 10 | Хмеленок А.Н. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 11 | Адамович С.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 12 | Лысов А.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 13 | Авдей В.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 14 | Колосницын В.С. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 15 | Шидловский П.Н. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 16 | Тарасова Е.В. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 17 | Марочкин Е.С. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |
| 18 | Ярмош Е.С. | Приз – мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Magnet Black (KG5n), денежные средства в размере 12,69 бел. руб. |

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 26.12.2022 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

---

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| **1** | **Капитальное строение** (здание специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Н 1-2/к), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Основателей, д. 25в, общей площадью 1767,3 кв. м, инвентарный номер 500/С-43329 | 2 481 637,11 | 714 285,71 |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123 000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями, исчисляемыми от разницы между начальной и минимальной ценой продажи, 5 (пять) раз, образуя цену лота, до минимальной или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (тридцать) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам:** https://iintorgi.by, www.iin.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Также сообщаем, что объект аукциона, принадлежащий Открытому акционерному обществу «Белвнешэкономбанк»:
1. В отношении объекта имеется ведомость технических характеристик от 16.04.2021, в которой отражены незарегистрированные изменения объекта (реконструкция). Имеется разрешение на продолжение строительства от 18.01.2022 № 73.
2. В отношении части земельного участка, на котором расположен объект, имеются ограничения (обременения) прав: охранная зона канализации, площадь 0,0907 га.
3. В объекте аукциона имеются арендаторы. Установленные сервитуты отсутствуют

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 25.11.2022 начало торгов – 10.00, окончание торгов – 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 24.11.2022 г. до 17.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. E-mail: e.pinchuk@iin.by** |

---

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**

## ООО «МИРАН-ПАРФЮМ»

(УНП 100008993 , г. Минск, ул. Бабушкина, д. 22, комн. 5),
**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 30 ноября 2022 года**.

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 15 ноября 2022 года по 28 ноября 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «МИРАН-ПАРФЮМ» (УНП 100008993)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «Деловой консалтинговый центр» Е.А. Поповой.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах **http://bankrot.gov.by/** и **http://www.specrealization.by/.**

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 185 (29807) за 21.09.2022

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества унитарного предприятия

## «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза»

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00135** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Торговое унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза» 220024, г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 62, каб. 215, тел. +375 17 3887621.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных электронных торгов 30 ноября 2022 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 255/С-15441 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А, общей площадью 803,8 кв. м, наименование: здание магазина, назначение: здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: пристройка, покрытие, участок 1, участок 2, подпорная стена на земельном участке с кад. № 220888126601000497 площадью 0,1774 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А (право аренды), целевое назначение зем. участка – для обслуживания здания магазина. Движимое имущество: стол письменный инв. № 0000082746 – 1 шт., урна металлическая, инв. № 0000181102 – 2 шт., охранно-пожарн. сигнализация, инв. № 0000181227 – 1 шт., шкаф холодильный, инв. № 0000181338 – 1 шт., огнетушитель, инв. № 0000181355 – 3 шт., котел отопительный, инв. № 0000181375 – 1 комплект, замок навесной, инв. № 0000181395 – 9 шт., урна для сбора батареек, инв. № 0000181443 – 1 шт., прилавок глухой, инв. № 0000181715 – 6 шт., сейф металлический, инв. № 0000199286 – 2 шт., замок врезной, инв. № 0000199287 – 5 шт., прилавок остекленный, инв. № 0000199393 – 7 шт., раковина керамическая на пьедестале, инв. № 0000199436 – 1 шт., светильник 1-ламповый, инв. № 0000199441 – 23 шт., светильник дневного света 2-ламповый, инв. № 0000199449 – 2 шт., штаба дверная металлическая, инв. № 0000199455 – 6 шт., радиаторы отопления, инв. № 0000199456 – 1 шт., весы циферблатные, инв. № 0000199458 – 1 шт., решетка металлическая оконная малая, инв. № 0000199506 – 4 шт., решетка металлическая оконная большая, инв. № 0000199507 – 16 шт., стол письменный однотумбовый, инв. № 0000199509 – 1 шт., куб, инв. № 0000199525 – 2 шт., стеллаж деревянный на 4 полки, инв. № 0000199604 – 1 шт., витрина холодильная молочная (регал), инв. № 0000199745 – 1 шт., банет, инв. № 0000199747 – 2 шт., система видеонаблюдения (монитор старого образца, видеорегистратор, камера вн. – 3 ед., камера нар. – 1 ед.), инв. № 0000199749 – 1 шт., горка металлическая малая, инв. № 0000199752 – 1 шт., прилавок деревянный, инв. № 0000199754 – 4 шт., прибор пожарной сигнализации старого образца, инв. № 0000199755 – 1 шт., кондиционер «Баллу» большой, инв. № 0000199757 – 1 шт., кондиционер «Баллу», инв. № 0000199759 – 1 шт., светильник дневного света, инв. № 0000199760 – 7 шт., светильник обычный на 4 лампы, инв. № 0000199762 – 12 шт., прилавок на металлических ножках, инв. № 0000199768 – 2 шт., светильник настенный, инв. № 0000199777 – 2 комплекта, шкаф для одежды однодверный, инв. № 0000199780 – 1 шт., шкаф для одежды двухдверный, инв. № 0000199783 – 3 шт., шкаф двухдверный, инв. № 0000199784 – 1 шт., ведро пластмассовое 10 л, инв. № 0000199792 – 2 шт., стол кассира, инв. № 0000199795 – 1 шт., стеллаж деревянный на 3 полки по 3 пролета, инв. № 0000199797 – 2 шт., шкаф электрический большой, инв. № 0000199800 – 3 шт., перила металлические 6 м, инв. № 0000199805 – 2 шт., горка деревянная для книг старого образца, инв. № 0000199812 – 2 шт., козырек пластиковый, инв. № 0000199816 – 2 шт., вывеска «Азерны», инв. № 0000199829 – 1 шт., стеллаж деревянный (2 пролета), инв. № 0000199843 – 1 шт., шкаф деревянный старого образца, инв. № 0000199845 – 1 шт., режим работы пластиковый световой, инв. № 0000199847 – 1 шт., светильник-люстра на 4 плафона, инв. № 0000199849 – 22 шт., горка пристенная торговая на 4 полки, инв. № 0000199850 – 9 шт., стол для тканей, инв. № 0000199851 – 2 шт., подиум деревянный 5,0х15 м, инв. № 0000199852 – 2 шт., подиум деревянный 5,0х2 м, инв. № 0000199853 – 1 шт., зеркало 1,4*0,6 м, инв. № 0000199854 – 1 шт., оборудование металлическое для ковровых изделий, инв. № 0000199855 – 1 шт., стол письменный 2 тумб., инв. № 0000199856 – 1 шт., прилавок деревянный для гвоздей старого образца, инв. № 0000199857 – 1 шт., стенд «Электронные отходы», инв. № 0000199858 – 1 шт., трап деревянный, инв. № 0000199859 – 16 шт., доска информации, инв. № 57930 – 1 шт., трап деревянный, инв. № 6332 – 9 шт.

Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, аг. Слободка, ул. Ленинская, 35А.

**Нач. цена:** 173 126,77 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 17 312,67 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: **до 16.00 29.11.2022**.

*Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».*

**Условия повторных электронных торгов**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение независимой оценки; оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 15 (пятнадцати) раб. дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в следующем порядке: если между продавцом и покупателем (победитель торгов либо претендент на покупку) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, оплата предмета электронных торгов должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Расходы продавца на проведение независимой оценки – 384,00 бел. руб. с НДС. Ранее опубликованное извещение – в газете «Звязда» от 18.08.2022, 12.10.2022. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by. Имущество бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Авраменко А.А., +375 29 751-77-74.

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис» (УНП 700003471), объявляет о проведении **29.11.2022 г.** в 09.00 электронных торгов на электронной торговой площадке **bankrottorg.by**

**Предмет торгов:**

| № п/п | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб., без НДС | Сумма шага, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. | Минимальная стоимость, бел. руб., без НДС |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Лот № 1 «Здание неустановленного назначения, общей площадью 5 234,30 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000031». Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 78 | 159 200,00 | 7960,00 | 15 920,00 | 39 800,00 |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375333014914.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 480,00 бел. руб; публикация в СМИ – 382,51 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, за оценку – 350,00 бел. руб., аукционный сбор 5 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения торгов.

# «Я З ВАМІ НЕ РАЗВІТВАЎСЯ НІКОЛІ...»

## Анатолю Ярмоленку — 75!

**Артыст, у якога шмат заслужаных узнагарод і ганаровых званняў; творца, у якога мноства адданых прыхільнікаў; спявак, чый голас — каштоўны сімвал Беларусі...**
**Анатоль Ярмоленка святкуе свой новы (юбілейны!) дзень нараджэння, — зручная нагода павіншаваць гаспадара нашай эстрады з яго вялікім святам і паразважаць пра ўнікальнасць яго спеўнага дару.**
**А яшчэ — спрыяльная прычына згадаць і самы пачатак яго дарогі...**



У жыцці і ў творчасці майстар трымаўся і трымаецца думкі: ёсць — дарога, а развітання — няма!

«Я з вамі не развітваўся ніколі...» — гэта не проста песня, якую ён спяваў, гэта яго лёс.

Так, ёсць свая дарога, па якой трэба ісці далей, і ёсць неадольныя ўспаміны, прага вярнуць у душу дзяцінства...

Дзяцінства Анатоля Ярмоленкі прайшло ў Казаціне Вінніцкай вобласці паблізу чыгункі.

У вялікі свет і ўдзень, і ўночы праз маленькі чыгуначны гарадок ляцелі цягнікі, і яны пакідалі ў чулай душы хлопчыка свой будзённы рытм.

Будзённы!

Аднак жа хацелася іншага рытму — святочнага; сэрца жадала, каб гучалі прыгожыя мелодыі, і, дзякаваць богу, святочны рытм і прыгожыя мелодыі ў сям'і гучалі.

Анатолева мама Надзея Анікіеўна цудоўна іграла на гітары і на фартэпіяна, а таксама добра спявала.

Слаўная клапатлівая жанчына!

Для яе выхаванне дзяцей, работа і хараство ўласнага дому былі найбольшай радасцю і шчасцем.

А яшчэ ўтульны дом дзяцінства аздабляла радыё — рэдкасць у пасляваенныя гады, і можна было штодня слухаць песні ў выкананні зорак савецкай эстрады.



ВІА «Сябры» – 1975 г.

Фота БелТА.

Старэйшы Анатолеў брат Святаслаў — разумны, працавіты і надзвычай таленавіты юнак — зрабіў магнітафон, і з'явілася магчымасць запісваць галасы любімых выканаўцаў.

Анатоль з вялікай увагаю і немалой цікавасцю праслухоўваў тыя запісы — яго, можна сказаць, чараваў ці не кожны гук, ці не кожная нота, ці не кожнае слова ў тых меладычных творах.

Так (спачатку дома!), а тады ўжо і ў школе спасцігаўся вабны свет вакальнага эстраднага мастацтва.

У школе жаданне спяваць узмацнілася, і наогул там адчуў сябе артыстам, калі першы раз у ліку ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці выйшаў на сцэну.

Школьныя гады праходзілі хутка, неўзабаве адкрылася новая сцэна — Анатоль прыйшоў у духавы аркестр Дома чыгуначнікаў і там, дапытлівы і да ўсяго цікаўны, даволі хутка авалодаў такімі музычнымі інструментамі, як альт і барытон, а тады ўжо стаў і спраўным бубначом — засвоіў ударныя прылады.

Дарэчы, любімы брат Святаслаў выдатна іграў на саксафоне.



Анатоль ЯРМОЛЕНКА з унукам Анатолем.

З маленства ад маці і брата Анатоль пераняў неабходнае — трэба штодня вучыцца, менавіта штодня трэба набліжаць сябе да майстэрства, да будучай прафесіі.

Галоўнае ж правіла ў той сямейнай (хатняй!) мудрасці было такім — трэба вучыцца быць добрым!

Пазней хатняя навука дапамагла артысту зразумець: мастацтва, не сагрэтае душою, мастацтвам называцца не можа!

Служба ў Савецкай Арміі ўмацавала веру юнака ў сваю сцэнічную адметнасць.

Анатоль Ярмоленка служыў у Баку, яго спеўны талент заўважылі, і малады салдат быў залічаны ў склад Ансамбля песні і танца, што значыла — гэты армейскі калектыў пабагацеў на непаўторны голас.

І ўжо тады аматары спеваў пачалі разбірацца, каб вызначыць: а што гэта за голас?

Лірычны тэнар?!

Так, лірычны тэнар — далікатны, мілагучны, пяшчотны, а галоўнае — удумлівы!

Сапраўды, служба ў арміі ўмацавала веру ў сваю адметнасць.

Раней гэтай веры надавала сілу матчына спрыянне і братава падтрымка; у арміі нечакана ж дапамаглі і жорсткія словы... Мусліма Магамаева.

У Баку артысты сустрэліся, і Магамаеў адчаканіў: «Спявак спеваку не сябар!»

Дарэчы, пра тую памятную сустрэчу вельмі цікава расказаў у таленавітай аповесці «Карабль друзей» музыкант Валерый Падукоў.

Анатоль Ярмоленка ўспрыняў пачутае ад Магамаева як добры знак: гэта праўда, спявак спеваку не сябар, а раз так, то ў сябры трэба клікаць уласны характар, уласны лёс, цвёрдасць духу і цяжкую працу!

А яшчэ ў сябры трэба клікаць сапраўдных сяброў, трэба іх шукаць...

Пасля службы ён задумаўся пра сваё таварыства.

Маючы здольнасці кіраўніка, арганізатара і дыпламата, заснаваў у Гомелі эстрадную групу «Сувенір», а тады, прайшоўшы праз аб'яднанне «Песні над Сожам», у 1972 годзе стварыў і вакальна-інструментальны ансамбль «Сябры».

Адзначу — для нашай культуры гэта гістарычная падзея: нарадзіўся мастацкі гурт, у назве якога выразна адлюстраваны яскравы нацыянальны вобраз, бо слова «сябры» тоеснае слову «беларусы».

Анатоль Ярмоленка паверыў у зорку «Сяброў» і ў тыя шчаслівыя гады мог бы сказаць: «Я здабыў плён і я задаволены, бо той, хто здабывае плён, заўсёды задаволены!»

У тыя гады Анатоль сустрэў Раісу, сваю каханую, у іх нарадзіліся хлопчык і дзяўчынка, — сонца ў тыя гады свяціла не толькі на небе, а ў думках і пачуццях, і ён, стваральнік «Сяброў», знаходзіўся ў прасторы свята, імя якому — радасць.

І, магчыма, тады ўпершыню ўсвядоміў, што ён далёкі ад артыстычнай вольніцы, так званай багемы, і вельмі блізкі да родных, да сям'і, бо сям'я і ёсць галоўнае, дзеля чаго варта жыць.

Гэтая выхаваўчая навука з цягам часу перайшла ад яго сыну Святаславу і дачцэ Вользе (Алесі), а пазней і ўнуку Анатолю Ярмоленку-малодшаму...

Не адзін год назіраючы за ім, цяпер ужо Анатолем Ярмоленкам-старэйшым, я не мог не заўважыць, што ён і на сцэне, і ў жыцці засцерагае сябе ад танных эстрадных эфектаў, ды, мусіць жа, дзякуючы гэтаму і на сцэне, і ў жыцці ён па-сапраўднаму творча малады.

Яго паводзіны самавітыя, а крэда зразумелае, як малітва: «Эстрада, папулярная музыка не проста від сцэнічнага мастацтва — гэта выхаванне душы...»

Ён не шукаў і не шукае лёгкай славы, славы на дзень, бо змалку навучаны: лёгкая слава — пустая забава.

Маючы прыродны голас, яркую ступень адоранасці, волю да жывога поспеху, здольнасць глыбока думаць, — сваю шырокую папулярнасць прыдбаў цярплівай працаю.

Ён умее слухаць іншых; умее дапамагчы, паспрыяць, падтрымаць — настроіць на бадзёры лад.

Прадстаўнік высокай эстрады, ён адпавядае ці не галоўнаму яе патрабаванню: звычайнае ператвараць у рамантычнае!

І заўсёды клапоціцца пра нацыянальную культуру.

Аднойчы пры мне маладая жанчына звярнулася да яго:

— Мой сын хоча стаць спеваком. Што вы яму параіце?

І атрымала параду:

— Хай пяе па-беларуску!

Тут хачу асабліва падкрэсліць — Анатоль Ярмоленка пашырыў гучанне нашай мовы на шматмільённую аўдыторыю, даў ёй вялізны абсяг песеннага існавання, прычым далёка за межамі Беларусі.

У 1984—1985 гадах я сустракаўся з чытачамі на Байкале і на прадпрыемстве «Дальрыба», чытаў вершы па-беларуску і быў прыемна ўражаны прызнаннем іркуцкіх студэнтаў і ўладзівастоцкіх рабочых: «А мы чулі ўжо беларускую мову! Мы слухалі выступленне Анатоля Ярмоленкі! Ён спяваў па-беларуску!»

На любой сцэне свету (скажам так, і ў Сібіры, і ў Амерыцы!) Анатоль Ярмоленка — прадстаўнік Беларусі, яе прыгожы змястоўны голас.

Ён пяе і тым самым гаворыць людзям: трэба ўмець перажыць нядобры час, а каб радавацца жыццю, трэба шукаць светлыя пачуцці.

Вобразы, якія стварае, менавіта светлыя, нават калі яны і зажураныя, таму ягоная філасофія супакойвае нервы.

Відавочны і той факт, што на публіку ён можа ўздзейнічаць і адной сваёй прысутнасцю, бо майстар — нават і ў тыя імгненні, калі маўчыць, калі проста трымае мікрафон, слухачам здаецца: ён пяе...

Анатоль Ярмоленка выхаваны на мастацтве, якое адпавядае ідэалам красы, і ў душы (не напаказ!) няўхільна спавядае прынцыпы, паводле якіх эстэтыка не ўзвышаецца над этыкай, — таму папулярнасцю не выхваляецца, вядомасць па-над розумам не ўзнімае, паважае сваіх прыхільнікаў, жыве для іх творча і з імі ніколі не развітваецца.

У адным са сваіх вершаў я паспрабаваў ад імя Анатоля адлюстраваць гэту важную думку:

*Я з вамі*
*не развітваўся ніколі —*
*Не Богам быў і не чараўніком,*
*А быў я проста*
*вашым Анатолем,*
*А быў я проста*
*вашым спеваком.*

*Як і раней,*
*для вас душой спяваю —*
*Душа тады душа, калі пяе,*
*Калі душу каханую шукае*
*І не шкадуе радасці свае.*

*Мне, як і вам,*
*адно і тое сніцца,*
*І бачацца і зблізку, і здалёк*
*У небе — усё тая ж Мілавіца,*
*У жыцці — усё той жа васілёк.*
*Чужое згіне,*
*роднае ўваскрэсне*
*І супакоіць тым душу маю,*
*Што Беларусь —*
*адзіная мне песня,*
*І гэту песню я для вас пяю.*

*Я з вамі не развітваўся ніколі,*
*Не Богам быў і не чараўніком,*
*І застаюся вашым Анатолем,*
*І застаюся вашым спеваком!*

**Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК.**

# ДАЛЬКАВІЧЫ ЗНІШЧЫЛІ ЗАБОЙЦЫ ХАТЫНЦАЎ

## Сведка тых падзей, партызан атрада «Барацьба» Васіль Даўжонак, дагэтуль памятае падрабязнасці трагедыі сваёй роднай вёскі

**13 мая 1943 года надвор'е ў тагачасным Плешчаніцкім раёне было цёплае і сонечнае. Лёгкі ветрык зрэдку парушаў вясновую цішыню і перашкаджаў у поўнай меры заслухацца спевамі птушак, якія вярнуліся з цёплых краёў. Жыхары вёскі Далькавічы займаліся палявымі работамі: аралі і сеялі ў полі, корпаліся ў сваіх агародах: вайна вайной, а есці было трэба. Партызаны, якія яшчэ з пачаткам акупацыі размясціліся ў тутэйшых лясах, заканчвалі акопы. Мясцовыя жыхары дапамагалі ім капаць траншэі — ішла падрыхтоўка да бою...**



Васіль Пятровіч ДАЎЖОНАК.

### ТАЛАКОЙ СУПРАЦЬ ВОРАГА

Плешчаніцкі раён гітлераўцы акупавалі ў ліпені 1941 года. У Далькавічы сталі рэгулярна прыходзіць немцы і паліцаі. Аднак гэта не перашкодзіла лейтэнанту Сяргею Далганаву, якому ўдалося выйсці з акружэння і не трапіць у палон да ворага, восенню 1941-га сабраць у тутэйшых мясцінах невялікую групу патрыётаў. Па першым часе туды ўваходзілі акружэнцы і чырвонаармейцы, якім удалося збегчы з палону. Паступова партызанскія шэрагі пачалі папаўняцца і мясцовымі жыхарамі. Тыя, хто не далучыўся да народных мсціўцаў, дапамаглі ім з адзеннем і прадуктамі — партызанскі атрад размяшчаўся недалёка ў лесе, дзе працякала рака Цна.

Паралельна даваенны старшыня калгаса Іван Качановіч арганізаваў у Далькавічах падпольную групу, у якую ўваходзілі мясцовыя жыхары і былыя школьнікі-старшакласнікі. 5 ліпеня 1941 года ён сабраў у лесе школьнікаў і расказаў ім, аб чым гаварылася ў апошнім выступленні Сталіна па радыё, у якім ён заклікаў да ўсенароднай барацьбы з акупантамі. Падлеткі, не раздумваючы, вырашылі змагацца з ворагам. Рабілі пасільную для іх працу: збіралі зброю і боепрыпасы, якія падчас бою пакідалі вайскоўцы, хавалі іх у надзейнае месца. Акрамя таго, юныя падпольшчыкі слухалі па радыёпрыёмніку апошнія навіны аб падзеях на фронце, распаўсюджвалі іх сярод мірнага насельніцтва.

— Неўзабаве група Канановіча здзейсніла дыверсію на дарозе паміж Далькавічамі і Прусавічамі, — расказвае краязнаўца Аляксандр Паўлюковіч. — Узброіўшыся піламі і сякерамі, падпольшчыкі зрэзалі слупы тэлефоннай сувязі, якія звязвалі вёскі з Плешчаніцамі. Праз некаторы час зладзілі засаду ў лесе паміж Далькавічамі і Прусавічамі. У той дзень з Плешчаніц прыехалі паліцаі на чатырох падводах і пачалі забіраць у жыхароў прадукты, цёплыя рэчы. Назад яны вярталіся нападпітку і нават не думалі, што ў лесе іх ужо чакае засада...

Нарабаваную маёмасць, якую везлі фашысты, падпольшчыкі раздалі мясцовым жыхарам. У выніку група Канановіча далучылася да атрада Далганава. Сумеснымі сіламі патрыёты Радзімы пачалі граміць ворага яшчэ з большай сілай. Неўзабаве гэтае боегатоўнае фарміраванне з лёгкай рукі камандзіра спецатрада НКДБ «Мясцовыя» Ваўпшасава стала называцца партызанскім атрадам «Барацьба».

### ВЁСКУ ПАЛІЛІ ТРОЙЧЫ

З красавіка 1942 года членам гэтага атрада стаў і юны жыхар вёскі Далькавічы Вася Даўжонак. Хлопцу не было і 17 гадоў, а ён ужо вызначыўся ў барацьбе з ворагам: разам з таварышамі ўдзельнічаў у дыверсіі па захопе чатырох падвод гітлераўцаў на дарозе паміж Далькавічамі і Прусавічамі, знайшоў і перадаў падпольшчыкам і партызанам нямала зброі.

Днямі Васіль Пятровіч адсвяткаваў свой 97-ы дзень нараджэння. Мы сустрэліся з ім у яго мінскай кватэры. Нягледзячы на сур'ёзны ўзрост, ён усё добра памятае: і тое, як пачалася Вялікая Айчынная вайна, і як змагаўся з ворагам у партызанскім атрадзе, і як аднаўлялася краіна пасля акупацыі, і як служыў у сілавых структурах. Дагэтуль Васіль Даўжонак не можа забыць, як карнікі палілі яго родныя Далькавічы...

Вёску знішчалі неаднойчы: і ў далёкім 1812 годзе французы, якія адступалі, і белапалякі ў 1920-м. Асабліва жорстка ў 1943 годзе з Далькавічамі і яе жыхарамі абышліся нацысты.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Васілю Даўжонку было 16 гадоў. Ён толькі скончыў сёмы клас. «Плешчаніцкі раён, дзе жыла наша сям'я, у якой выхоўвалася 11 дзяцей, быў акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі на дзясяты дзень вайны, — расказвае ён. — Захапіўшы раённы цэнтр, немцы адразу пачалі ствараць свае органы кіравання: прызначылі бургамістраў, арганізавалі жандармерыю, паліцыю, з'явілася тут і СД. З падраздзяленняў СС і рэгулярных часцей у Плешчаніцах размясціўся вялікі воінскі гарнізон. Пачаліся арышты камуністаў, актывістаў, чырвонаармейцаў, якія хаваліся, яўрэяў».

Немцы забіралі ў людзей усё, што было можна: і скаціну, і збожжа, і прадукты харчавання. Жыхары задумаліся, як жыць далей. Многія з іх, асабліва моладзь, паспяшаліся дапамагаць партызанам, каб найхутчэй выгнаць фашыстаў з нашай зямлі. У прамым сэнсе давялося абараняць свой родны дом. Па словах Васіля Даўжонка, раёны, якія прылягалі да Барысава (Плешчаніцкі, Бягомльскі), падвергліся жорсткай расправе гітлераўцаў з-за таго, што практычна ўсё насельніцтва пайшло ў партызаны.



У Далькавічах увекавечаны і жыхары навакольных вёсак, знішчаных акупантамі.

### НЯРОЎНЫ БОЙ

Позняй раніцай 13 мая 1943 года разведчык далажыў камандзіру атрада, што ў напрамку Далькавічаў ідуць немцы — іх намерам, па папярэдняй інфармацыі партызан, быў захоп вёскі, маёмасці жыхароў і расправа з людзьмі. Сяргей Далганаў загадаў партызанам, якія займалі абарону ў гэтым напрамку, падрыхтавацца да бою. Удзельнікам тых падзей быў і Васіль Даўжонак.

— З узлеску і хмызнякоў сталі з'яўляцца п'яныя нямецкія салдаты, апранутыя ў жоўтую форму адзення, са зброяй у руках, — успамінае ветэран. — Яны размахвалі ёй, гучна крычалі, патрабавалі выклікаць для перамоў камандзіра. Нам, партызанам, прапаноўвалі здавацца ў палон. У гэтай лагчыне, якая цягнулася ўздоўж ручая, сабралася прыкладна 50 фашыстаў. Па камандзе камандзіраў з усёй зброі, што ў нас была, мы адкрылі па праціўніку агонь — пачаўся бой.

Партызаны знішчылі каля 20 гітлераўцаў. Астатнія адступілі. Аднак на гэтым бой не скончыўся. Наадварот, ён набыў больш жорсткі характар. Карнікі, якія падаспелі на дапамогу сваім п'яным салдатам, акружылі Далькавічы з трох бакоў і адкрылі агонь па партызанах са стралковай зброі і кулямётаў. Мікалай Глінскі ўпэўнена знішчаў з ручнога кулямёта немцаў, пакуль у яго не скончыліся патроны. Партызан па-геройску загінуў. Як і Зіна Бічун, якая на сваім кані апынулася падчас бою ў атачэнні фашыстаў. Яны спрабавалі ўзяць дзяўчыну ў палон, але адважная партызанка не здалася. Тады нямецкі афіцэр застрэліў Зіну з пісталета. Народныя мсціўцы ўступілі з ворагам у рукапашную, аднак перавага ў сіле была не на іх баку. У тым баі загінула восем партызан. Іх памяць увекавечана на помніку, усталяваным у вёсцы Прусавічы тагачаснага Плешчаніцкага раёна.

З-за таго, што сілы партызан і гітлераўцаў былі няроўныя, а таксама па той прычыне, што праціўнік у некалькі разоў пераўзыходзіў па колькасці ўзбраення, камандаванне атрада «Барацьба» было вымушана аддаць загад для адыходу партызан на другую лінію абароны ў раён вёсак Глебаўшчына і Прусавічы.

Гітлераўцы таксама панеслі ў тым баі немалыя страты. Па даных партызанскай разведкі, яны страцілі двух афіцэраў і 20 салдат, 34 чалавекі былі параненыя. «Гэта прымусіла карнікаў адмовіцца ад далейшага наступлення ў бок Бягомля, і яны вымушаны былі з нарабаванай маёмасцю адступіць ранейшым маршрутам у Плешчаніцы, — расказвае ўдзельнік тых падзей. — На павозцы з апушчанымі ад ганьбы галовамі ехалі верхаводы 118-га паліцэйскага батальёна маёр Кёрнер і падпалкоўнік Смоўскі. Здраднік Васюра (той, які прымаў удзел і ў знішчэнні Хатыні. — **«Зв.»**) панура ішоў пешшу. На бартавой машыне праціўнік вёз забітых і акрываўленых параненых салдат і афіцэраў».

За гэтай ганебнай працэсіяй назіралі жыхары вёскі Гарадзец, што за пяць кіламетраў ад Далькавічаў. Па іх словах, немцы, п'яныя, ішлі ў бой, выкрыкваючы прывітальныя словы фашысцкаму карніку «Хайль Гітлер!» Вярталіся ж яны ў Плешчаніцы ўжо не так ваяўніча.



### ЗДЗЕКАВАЛІСЯ СА СТАРЫХ І ХВОРЫХ

Фашысты не прыдумалі нічога лепшага, як спагнаць сваю злосць на жыхарах вёскі Далькавічы. Некалькі факелаў — і населены пункт быў ахоплены полымем. Усе 55 сем'яў — менавіта столькі тут стаяла хат — у адзін момант засталіся без даху над галавой. Разам са сваёй вёскай загінулі шэсць жыхароў: пажылыя і хворыя, якія не маглі ўцячы. Астатнія скарысталіся гэтай магчымасцю: адны сышлі да партызан раней, іншыя ўцяклі ў лес і балота адразу ж, калі паміж партызанамі і гітлераўцамі завязаўся бой. Многія разумелі, чым усё можа скончыцца. На літасць фашыстаў тут ніхто не разлічваў.

Перад тым, як спаліць людзей, якія засталіся ў сваіх хатах, немцы іх жорстка катавалі: білі пажылых людзей і інвалідаў палкамі, вязалі калючым дротам, рэзалі нажамі, калолі штыкамі, выколвалі вочы, адразалі вушы... Не пашкадавалі нават сляпую Дар'ю Коўшык. Такім зверскім спосабам карнікі хацелі даведацца ўсю інфармацыю пра партызан. Аднак, не дабіўшыся патрэбнага (што маглі расказаць ім старыя і нямоглыя людзі?!), ні ў чым не вінаватых мірных грамадзян расстралялі ва ўласных хатах. Здзекаваліся нават з целаў забітых. Затым падпалілі хаты, у якіх яны жылі, — згарэла ўся вёска. На наступны дзень аб тым, што тут быў вялікі населены пункт, нагадвала толькі папялішча.

Тых, каму не ўдалося пазбегнуць гітлераўскай расправы, пахавалі ў брацкай магіле на праваслаўных могілках у Далькавічах. Ахвярамі фашысцкіх нелюдзяў сталі Герасім Кананович (86 гадоў), Даніїл Арыніч (68 гадоў), Ганна Кананович (62 гады), Мар'я Усцін (66 гадоў), Пелагея Кананович (72 гады), Дар'я Коўшык (63 гады).

Пажар, у якім не стала яго аднавяскоўцаў і цэлай вёскі, — у Васіля Даўжонка дагэтуль у вачах. «Такі дым быў: столькі ж хат гарэла! — эмацыянальна кажа ён. — Людзі, хаваючыся ў лесе, назіралі за гэтым жахам. Аднак нічога зрабіць не маглі...»

З вялікай сям'і Васіля Даўжонка ніхто не пацярпеў: на момант, калі палілі вёску, нікога з іх не было ў хаце. Затое напярэдадні трагедыі гітлераўцы да смерці закатавалі яго бацьку.

— Ён, цяжка хворы, ляжаў у хаце, — узгадвае Васіль Пятровіч. — Бацьку схапілі за валасы, сцягнулі з ложка. Затым выцягнулі на сярэдзіну двара і пачалі дапытваць. Патрабавалі, каб ён забраў сваіх сыноў з партызанскага атрада і выдаў немцам. Нас, братоў, у партызанах было трое. Вядома, бацька не мог пагадзіцца на патрабаванні карнікаў. Тады яны пачалі яго катаваць: білі, адразалі вушы... Так здзекаваліся са старога, што бацька неўзабаве памёр.

### СВЕДЧЫЎ СУПРАЦЬ ВАСЮРЫ

Пасля вайны вёска адрадзілася. Вярнуліся некаторыя яе жыхары, прыехалі ў пошуках іншага жыцця бежанцы, з'явілася на свет новае пакаленне далькаўчан. Аднак ніколі тут не забываліся аб той страшнай трагедыі, якая напаткала вёску ў маі 1943 года. Аб тым страшным дні нагадвае помнік на ўскрайку Далькавічаў. Увекавечаны тут і спаленыя жыхары навакольных населеных пунктаў: Альхоўкі, Капатніцы, Чэрніцы, Губы, Тарасіна і Забалацця. Кожная ахвяра гітлераўскай расправы — пайменна. Аб гэтым паклапаціўся Васіль Даўжонак. Ён асабіста займаўся ўстаноўкай помніка, складаў і ўдакладняў спісы загінулых. Заслуга ўдзельніка тых падзей і ў тым, што ў 1975 годзе з'явіўся помнік і ў вёсцы Прусавічы, дзе ўвекавечана памяць партызан, якія загінулі ў баі за вёску Далькавічы 13 мая 1943 года.

У пасляваенны час ветэран удзельнічаў у ваенных трыбуналах, дзе выступаў у якасці сведкі злачынстваў фашыстаў. На адным з пасяджэнняў ён даваў паказанні і супраць начальніка штаба 118-га карнага батальёна Рыгора Васюры, які ў тым ліку ўдзельнічаў у знішчэнні Хатыні. Калі ў 1980-х гадах следчыя выйшлі на Васюру, ён жыў ва Украіне і добра сябе адчуваў: працаваў намеснікам старшыні калгаса, атрымліваў да памятных дат узнагароды, уладкаваў прыстойнае жыццё дзецям. На судзе над найбольш вядомым карнікам у якасці сведкі прысутнічаў і Васіль Даўжонак, які даваў паказанні па знішчэнні 118-м батальёнам роднай вёскі.

13 мая 1943 года, падчас правядзення карнай аперацыі ў вёсцы Далькавічы, Рыгор Васюра кіраваў баявымі дзеяннямі паліцэйскага батальёна супраць партызан, якія абаранялі населены пункт. Па словах Васіля Даўжонка, Васюра асабіста здзекаваўся з захопленых у палон жыхароў. Гэты фашысцкі кат разам з іншымі ўдзельнікамі знішчэння Далькавічаў і яе жыхароў, Эрыхам Кёрнерам і Канстанцінам Смоўскім, здзейснілі нямала крымінальных злачынстваў падчас карных аперацый у Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях. Усе іх злачынствы былі даказаны Ваенным трыбуналам 1986 года. І калі на Кёрнера і Смоўскага следчым выйсці не ўдалося, то ў адносінах да Васюры была прыменена выключная мера пакарання — расстрэл. Прыгавор быў прыведзены ў выкананне.



Помнік спаленым жыхарам вёскі Далькавічы з'явіўся дзякуючы В. ДАЎЖОНКУ.

Адразу пасля вайны, у студзені 1946 года, адбыўся суд над нямецкімі ваеннапалоннымі, на якім таксама ў якасці ахоўніка палка НКУС прысутнічаў Васіль Даўжонак. «Усе яны прызнавалі сваю віну, раскайваліся, лаялі Гітлера, крычалі: «Гітлер капут!», — успамінае дэталі судовага пасяджэння Васіль Пятровіч. — І ў той жа час апраўдваліся: маўляў, выконвалі загад нямецкага камандавання».

### «БАРАЦЬБА» АДКРЫВАЛА ПАРАД

Да самага вызвалення Беларусі Васіль Даўжонак змагаўся з ворагам у шэрагах партызан: удзельнічаў у разгроме гарнізонаў ворага, у мініраванні дарог, у засадах, «рэйкавай вайне». Як і многія яго паплечнікі, перажыў не адну блакаду. Асабліва цяжка прыйшлося падчас апошняй, якая мела кодавую назву «Кармаран». Аднак дзякуючы мясцоваму праваднiку, атраду практычна без страт удалося выйсці з акружэння. Неўзабаве пачалася наступальная аперацыя Чырвонай Арміі «Баграціён». Партызаны атрада «Барацьба» брыгады «Народныя мсціўцы» непасрэдна ўдзельнічалі ў вызваленні Плешчаніц, Вілейкі, Маладзечна, населеных пунктаў Літвы.

Васіль Даўжонак ужо ваяваў у шэрагах Чырвонай Арміі, як загадам вышэйшага кіраўніцтва партызаны брыгады «Народныя мсціўцы» імя Варанянскага былі выкліканы для ўдзелу ў парадзе, запланаваным у вызваленым Мінску. Размова ідзе пра знакаміты партызанскі парад, які адбыўся 16 ліпеня 1944 года. Адкрывалі парад народныя мсціўцы атрада «Барацьба». Васіль Даўжонак ішоў у першых шэрагах.

Гэты парад потым увайшоў у гісторыю. І запомніўся гледачам ён найперш козлікам па імені Малыш, які ішоў побач з партызанамі. Гаспадарамі гэтай знакамітай ужо сёння жывёліны былі менавіта народныя мсціўцы атрада «Барацьба».

Ветэран расказаў, як Малыш трапіў да іх у атрад: «Партызанскія атрады шмат грамілі нямецкія гарнізоны, у тым ліку Куранец, недалёка ад Вілейкі. Загінулі тады і паліцаі, і немцы. Пасля бою, калі мы пачалі сыходзіць, да нас прывязалася казляня. Мы ідзём, і яно за намі — ніяк не адстае. А ў нас былі дзяўчаты-партызанкі. Яны яго прыбралі, стужкі павязалі і прывялі ў атрад. З намі Малыш знаходзіўся да канца вызвалення Беларусі. У баях — ва ўкрыццях. Мы хаваемся за дрэва, і ён гэтак жа. Ручны быў. Пасля парада партызанскія атрады пачалі расфарміроўваць. Узнікла пытанне: што рабіць з казлянём? На вуліцы Грушаўская знайшоўся чалавек, якому і аддалі Малыша».

Васіль Даўжонак прызнаецца, што не хваляваўся, калі ўдзельнічаў у партызанскім парадзе. «Сам факт выклікаў задавальненне і радасць — мы былі вызваленыя! — згадвае ён тагачасны настрой. — Думалі, што будзе далей. Некаторыя партызаны сышлі на фронт, дзе працягвалі змагацца з ворагам. Астатніх пакінулі для аднаўлення народнай гаспадаркі».

### З КЛОПАТАМ АБ ПАМЯЦІ

Пасля партызанскага парада Васіль Даўжонак быў накіраваны на службу ў шэрагі войск НКУС. Дачакаўшыся Перамогі, вырашыў стаць кадравым вайскоўцам і паступіў у Харкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча. Пасля атрымання першых афіцэрскіх пагонаў служыў на пагранічнай заставе ў Сярэдняй Азіі: ахоўваў граніцу і з Афганістанам, і з Іранам. Затым была служба ў Далёкаўсходняй погранакрузе, дзе займаў пасаду начальніка палітаддзела 78-га пагранічнага атрада. Пасля выхаду ў адстаўку ў званні палкоўніка Васіль Даўжонак вярнуўся на радзіму, стаў жыць у Мінску. Шмат гадоў выкладаў ваенную справу ў адной з сярэдніх школ сталіцы, удзельнічаў у патрыятычным выхаванні моладзі. Вялікая Айчынная вайна, 50 гадоў у армейскіх шэрагах, чатыры вышэйшыя навучальныя ўстановы за плячыма — яму было і ёсць што расказаць падрастаючаму пакаленню.

На кожнай сустрэчы з дзецьмі ён распавядае аб трагедыі, якая напаткала яго родныя Далькавічы ў маі 1943 года. Увекавечыўшы памяць загінулых у гады вайны землякоў у помніках на сучаснай Лагойшчыне, аб гераічнай барацьбе з ворагам і гібелі яго вёскі Васіль Пятровіч напісаў у кнігах «Сыходзілі ў паход партызаны», «Партызанскія сыны Беларусі», «Партызанскімі сцяжынамі». Аднак самая галоўная заслуга Васіля Даўжонка, па меркаванні яго землякоў, — у тым, што дзякуючы яго намаганням у Далькавічы пракладзена добрая дарога. Ветэран не хавае: у гэтым ёсць і яго асабісты інтарэс. Справа ў тым, што, нягледзячы на свой сур'ёзны ўзрост, кожны год Васіль Пятровіч імкнецца наведаць помнікі ў яго родных Далькавічах і суседніх Прусавічах, каб каторы раз пакланіцца сваім таварышам-партызанам, якія загінулі ў баі за родную вёску, а таксама бязвінна забітым аднавяскоўцам, спаленым ва ўласных хатах.

Гэты год не стаў выключэннем. Нават у свае 97 гадоў удзельнік і сведка тых падзей не мог парушыць сваю даўнюю традыцыю і не выканаць свой святы абавязак — як грамадзяніна, удзячнага нашчадка і патрыёта.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аляксандра ПАЎЛЮКОВІЧА.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ 52 23-29ма, инв. № 1526 | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 2 | Дробилка дкм-5 п/х, инв. № 1747 | 5 184,00 | 518,40 | 259,20 |
| 3 | Весы автом., инв. № 167-О | 7 020,00 | 702,00 | 351,00 |
| 4 | Разбрас. мин. удоб. рду-1, инв. № 250-О | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 5 | Комб. ДОН-1500 92-05 БШ ОСИП. соб. РАС, инв. № 277-О | 27 108,00 | 2 710,80 | 1 355,40 |
| 6 | Комбайн К-Г-6-К4631-17, инв. № 3045-о | 15 336,00 | 1 533,60 | 766,80 |
| 7 | Весы рп-15 т, инв. № 305Т | 2 592,00 | 259,20 | 129,60 |
| 8 | Весы для взвешивания ск, инв. № 3067 | 669,60 | 66,96 | 33,48 |
| 9 | Косилка-плющилка ротационная КПР-9, инв. № 3118 | 21 168,00 | 2 116,80 | 1 058,40 |
| 10 | Опрыскиватель мекосансоб. РАС, инв. № 317-О | 6 372,00 | 637,20 | 318,60 |
| 11 | Раздатчик кормов рск-12 рас, инв. № 319-О | 8 316,00 | 831,60 | 415,80 |
| 12 | Прицеп 857100 36-43 аа5 осип, инв. № 4504 | 2 808,00 | 280,80 | 140,40 |
| 13 | Кран-балка шил (3 т, 11 м), инв. № 531 | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 14 | Котел для нагрева воды, инв. № 607Т | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 15 | Станок 62 г шил, инв. № 627 | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 16 | Кран-балка (3 т, 10,5 м), инв. № 63-О | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 17 | Станок токарно-винт. 163, инв. № 679 | 4 320,00 | 432,00 | 216,00 |
| 18 | Станок верт-фрез. 6м12п, инв. № 686 | 3 348,00 | 334,80 | 167,40 |
| 19 | Плющилка зерна КОРМ-10 соб. рас, инв. № 686Т | 529,20 | 52,92 | 26,46 |
| 20 | Комбайн кзр-10 67-91ок, инв. № 688Т | 13 068,00 | 1 306,80 | 653,40 |
| 21 | Станок 2 м 112 наст-свер, инв. № 712 | 896,40 | 89,64 | 44,82 |
| 22 | Кран-балка опорная шил. (3 т, 10,5 м), инв. № 782 | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 23 | Кран опорный дл 10.5 (3 т), инв. № 789 | 3 672,00 | 367,20 | 183,60 |
| 24 | Кран-балка подвесная (5 м, 0,5 т), инв. № 794-1 | 1 404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 25 | Кран подвесной шил. (5 м, 1 т), инв. № 795 | 1 836,00 | 183,60 | 91,80 |
| 26 | Доил. устан. 2адсн, инв. № 3051А | 306,00 | 30,60 | 15,30 |
| 27 | Электросирена с-40, инв. № 6003 | 16,20 | 1,62 | 0,81 |
| 28 | Каток водоналивной, инв. № 52-О | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 29 | Охладитель молока, инв. № 52-О2 | 204,00 | 20,40 | 10,20 |
| 30 | Охладитель молока, инв. № 611Т | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 31 | Станок сом-400б, инв. № 1568 | 66,00 | 6,60 | 3,30 |
| 32 | Водонагреватель, инв. № 3062 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 33 | Водонагреватель, инв. № 3074 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 34 | Водонагреватель, инв. № 321-О | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 35 | Водонагреватель, инв. № 322-О | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 36 | Станок токарно-винторезный 1Е61МТС, инв. № 829 | 264,00 | 26,40 | 13,20 |
| 37 | Кап. строение с инв. № 631/С-66692 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; наименование – здание крытой стоянки, общая площадь – 1 476,5 кв. м) | 45 780,00 | 4 578,00 | 2 289,00 |

В отношении лотов №№ 1–25 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 15.
В отношении лотов №№ 26, 27 проводятся девятые повторные торги. **Стоимость снижена на 95 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29691) от 09.04.2022, стр. 10, № 95 (29717) от 18.05.2022, стр. 15, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 209 (29831) от 25.10.2022, стр. 11. В отношении лотов №№ 28–30 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 90 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 83 (29705) от 29.04.2022, стр. 14, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 209 (29831) от 25.10.2022, стр. 11.
В отношении лотов №№ 31–36 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 90 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 101 (29723) от 26.05.2022, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 209 (29831) от 25.10.2022, стр. 11.
В отношении лота № 37 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 209 (29831) от 25.10.2022, стр. 11

Местонахождение лотов №№ 1–36: Минская обл., Вилейский р-н, д. Осиповичи.
Местонахождение лота № 37: Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, аг. Шиловичи, ул. Советская, 9/7.
Лот № 37 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385412101000188, площадью 0,4354 га, для строительства и обслуживания крытой автомобильной стоянки. Право постоянного пользования

В отношении Лота № 37 имеется обременение в виде аренды. По вопросам обременений обращаться по тел. 80172552928

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **28 ноября 2022 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 15 ноября 2022 года до 16.00 24 ноября 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 28.11.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов (по Лотам №№ 1–36); 5 % от конечной цены предмета торгов (по Лоту № 37).**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Чеслав, +375299999112. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293042560, Андрей.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЮРИДИЧЕСКОГО ЛИЦА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ПРОЦЕССЕ ЛИКВИДАЦИИ

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00136 и № 2022.Ч.002.00137** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by/

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская, 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов № 2022.Ч.002.00136 30 ноября 2022 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**ЛОТ № 1. Установка для штабелирования досок (за один участок штабелирования), инв. № 645, по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36.**

**Нач. цена: 128 484,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**

**Задаток: 12 848,40 бел. руб.**

***Условия повторных электронных торгов № 2022.Ч.002.00136*:** Победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи.

**Дата и время проведения повторных торгов № 2022.Ч.002.00137 30 ноября 2022 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 240/С-32660 площадью 383,4 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36, наименование – здание административно-бытового корпуса, назначение – здание административно-хозяйственное. Кап. строение с инв. № 240/С-32678 площадью 404,6 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/1, наименование – гараж, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: смотровая яма. Кап. строение с инв. № 240/С-32677 площадью 64,5 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/2, наименование – здание центрального теплового пункта, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Кап. строение с инв. № 240/С-32673 площадью 11,7 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36/3, наименование – Здание контрольно-пропускного пункта, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: ограждение (забор железобетонный, забор металлический на бетонных столбах, забор кирпичный, калитка, ворота № 1, ворота № 2, ворота № 3, ворота № 4). Кап. строение с инв. № 240/С-32680 протяженностью 344,7 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная теплосеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 240/С-32681 протяженностью 308,9 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внутриплощадочная теплосеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 240/С-32682 протяженностью 92,7 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная сеть хозпитьевого водопровода, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32684 протяженностью 309,9 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – Внутриплощадочная сеть хозпитьевого водопровода, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32686 протяженностью 287,8 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внеплощадочная сеть напорной бытовой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-32687 протяженностью 211,5 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, площадка № 1, наименование – внутриплощадочная сеть бытовой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 240/С-129751 площадью 816,3 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, раскройно-заготовительный цех, наименование – Раскройно-заготовительный цех, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Кап. строение с инв. № 240/С-129752 площадью 24 530,4 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 240/С-129753 протяженностью 648,6 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети дождевой канализации, наименование – Сети дождевой канализации, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: песковые площадки, канализационная насосная станция, очистные сооружения дождевых вод. Кап. строение с инв. № 240/С-129754 протяженностью 1048,0 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети противопожарные, наименование – сети противопожарные, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, составные части и принадлежности: сети водопровода, пожарный водоем № 2, пожарный водоем № 1. Кап. строение с инв. № 240/С-129755 протяженностью 629,0 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети связи, наименование – сети связи, назначение – сооружение специализированное связи. Кап. строение с инв. № 240/С-129756 площадью 2,5 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, канализационно-насосная станция бытовых стоков, наименование – Канализационно-насосная станция бытовых стоков, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Сети электроснабжения, 2008 г. п., протяженность линейного сооружения 2868,4 м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, сети элекроснабжения, инв. № 263, составные элементы: электроснабжение 0,4кВ, электроосвещение наружное, электроснабжение 10 кВ. Кап. строение с инв. № 240/С-129757 площадью 1724,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, склад несортированного круглого леса, наименование – склад несортированного круглого леса, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Кап. строение с инв. № 240/С-129758 площадью 1861,6 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, склад сортированного круглого леса, наименование – склад сортированного круглого леса, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ. Недвижимое имущество находится на зем. участке с кадастровым № 223656200001000209 площадью 4,0806 га по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36 (право постоянного пользования) и зем. участке с кадастровым № 223656200001000210 площадью 0,2906 га по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Ореховский с/с, г. п. Ореховск (право постоянного пользования).

Кран мостовой подвесной электрический (два двутавра, кран-балка, электроталь), инв. № 510, котел КВГТ-100 (ТЭМ 100), инв. № 770, теплосчетчик ТЭМ 104-2, инв. № 257, станок заточной по металлу, инв. № 521, станок торцовочный ЦМЭ, инв. № 4, станок для вальцевания ленточных пил Mebor VP210, инв. № 765, станок заточной для ленточных пил Mebor Ba530 инв. № 764, станок плоскошлифовальный Reform AR13/51, инв. № 304, станок для обработки боковой поверхности зуба vollmer.tupe chhf 21H, инв. № 304, станок Vollmer LG21H для перепоя зуба бурой инв. № 304, зубозаточной станок с ЧПУ Vollmer CHC Eco, инв. № 304, навес, инв. № 913, фундаментные блоки (склад щепы), инв. № 320, блок питания БиРП 24-3, инв. № 268, модуль сопряжения, инв. № 270, прибор «Аларм», инв. № 269, пункт ПР № 02-14УЗ, инв. № 508, вводное устройство ВРУ, инв. № 297, шкаф ПР85-1н1-3-101-4 инв. № 279, шкаф ПР85-1н1-3-101-4, инв. № 280, шкаф ПР85-1н1-3-101-4, инв. № 294, шкаф распределительный ПР 85 ИН 1-3, инв. № 278, шкаф распределительный ПР 85 ИН 1-7, инв. № 277, шкаф распределительный Щ81-ИНБ-1А-100 инв. № 276, шкаф Щ81-ИНБ-4, инв. № 275, шкаф Щ81-ИНБ-5, инв. № 274, щиток вводно-распределительный, инв. № 507, щиток вводно-распределительный, инв. № 509, электродвигатель «Аир» 160 м 18,5/1500 об, инв. № 255, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220.011, инв. № 154, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220.011, инв. № 155, электрокалорифер ЭВУТ 1.0/220.011, инв. № 156, ячейка № 1, инв. № 494, ячейка № 2, инв. № 493, агрегат ФЛИГТ, инв. № 252, агрегат ФЛИГТ, инв. № 253, панель управления ФЛИГТ в комплекте, инв. № 249, датчик реле разности давления, инв. № 512, насос СМ 125-80-315А-4, инв. № 256, устройство ж/д переездов, инв. № 204, малые архитектурные формы (2 комплекта), инв. № 213, комплект офисной мебели, инв. № 7028. Схема движения (ПВХ 6 мм), 1 шт., беседка, 1 шт., вывеска на козырек 4840х780 мм, 1 шт., ленточная пила 140Х1, 2Х7,350 шаг 45 мм – 4 шт., механическое лентообвивочное устройство МУЛ -17 – 1 шт., пила дисковая тв./сп.D350 d110, 2 шт., лента латунная, 1,8 кг, огнетушитель ОП-4 – 3 шт., огнетушитель ОП-4 – 1 шт., ведро пожарное – 2 шт., топор, 1 шт., полипропилен гранулированный – 1,4 тонны, телевизор «Витязь», 1 шт., флаг РБ, 1 шт., шкаф НФ металлический для бытовых помещений – 11 шт., электрорадиатор масленый, 1 шт., контейнер для ТБО, 1 шт., громкоговоритель рупорный – 3 шт., фонарь, 6 шт., светильник – 14 шт., прожектор осветительный – 30 шт., лампа уличного освещения – 29 шт.

**Движимое имущество находится по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. Ленина, 36.**

**Нач. цена: 496 640,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 49 664,00 бел. руб.**

***Условия повторных электронных торгов № 2022.Ч.002.00137*:** Победитель (претендент на покупку) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги оператора ЭТП согласно прейскуранту ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, расходов на проведение независимой оценки, услуг оператора ЭТП; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета торгов. Имущественные права не зарегистрированы в установленном порядке на сети электроснабжения (имеется ведомость технических характеристик). В соответствии с п. п. 9.1. Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области» государственная регистрация создания объектов недвижимого имущества, право собственности на которые не зарегистрировано в установленном порядке на момент отчуждения, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на них осуществляется по заявлению покупателя (приобретателя), подаваемому не позднее двух лет со дня заключения договора купли-продажи (безвозмездной передачи), на основании технического паспорта. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с законодательством.

**Повторные электронные торги № 2022.Ч.002.00136 и № 2022.Ч.002.00137** проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам № 2022.Ч.002.00136 и № 2022.Ч.002.00137: до 16.00 29.11.2022.**

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

***Сумма задатка по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код операции: 40901.***

Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения эл. торгов, отказаться от проведения эл. торгов. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by.

Имущество бывшее в употреблении. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна +375292953541.

# ДАСТОЙНЫ АДКАЗ СУЧАСНЫМ ВЫКЛІКАМ І ПАГРОЗАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Амаль два дзесяцігоддзі таму — з 2004/2005 навучальнага года — па даручэнні Прэзідэнта ва ўсіх тыпах навучальных устаноў пачаў выкладацца факультатыў па вывучэнні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тады ж калектывам беларускіх вучоных, выкладчыкаў ВНУ і педагогамі школ быў падрыхтаваны адпаведны навучальны дапаможнік (ён двойчы перавыдаваўся), хрэстаматыя, дапаможнік для настаўніка, даведнік, рабочы сшытак і атлас.

У гэтых выданнях — вынік шматгадовай працы аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Кавалені.

## Не даць перапісаць гісторыю

— Сімвалічна, што кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу былі абноўлены ў 2022 годзе, які аб'яўлены ў Беларусі Годам гістарычнай памяці і праходзіць пад знакам захавання праўды пра ўсе перыяды існавання беларускага народа, — адзначыў на прэзентацыі **начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Эдуард ТАМІЛЬЧЫК**. — Дзякуючы рабоце аўтараў і рэцэнзентаў нашы навучэнцы і педагогі атрымалі вучэбна-метадычны комплекс, які не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Ён быў высока ацэнены прафесійнай гістарычнай супольнасцю дзяржаў — удзельніц СНД як узор аб'ектыўнага прадстаўлення гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і сродак эфектыўнага выхавання ў падрастаючага пакалення пачуцця патрыятызму і гонару за свой народ.

«Вялікая Айчынная вайна і праз многія дзесяцігоддзі працягвае жыць у сэрцах беларускіх людзей як сімвал трагедыі і гераізму савецкага народа, воінскай славы, адзінства і ўзаемадапамогі. Сёння вельмі важна данесці да падрастаючага пакалення гэту гістарычную праўду, аб'ектыўна паказаць ролю нашых дзядоў і прадзедаў у разгроме фашысцкага нашэсця, — падкрэсліў Эдуард Тамільчык. — Значнасць захавання гістарычнай памяці знайшла сваё адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Мы ўпершыню на постсавецкай прасторы замацавалі ў Асноўным Законе краіны важнасць захавання гістарычнай праўды і памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, масавым гераізме нашага народа. Размах фашысцкага тэрору быў такі, што мы да гэтага часу не ведаем дакладнай колькасці страт.

Сучасныя падзеі з усёй відавочнасцю паказваюць, што толькі разам, захоўваючы памяць аб гераічных і трагічных днях Вялікай Айчыннай вайны, асэнсоўваючы важнасць яе ўрокаў, можна даць дастойны адказ сучасным выклікам і пагрозам. Важную ролю ў аб'ектыўным паказе гістарычнай праўды для падрастаючага пакалення будзе адыгрываць абноўлены вучэбна-метадычны комплекс. У ім — аб'ектыўная ацэнка падзей, а значыць, годны адказ усім спробам забыцца пра зверствы, якія фашысты здзяйснялі на нашай зямлі, перапісаць гісторыю вайны і забыцца пра вялікі подзвіг савецкага салдата, які крывёй заплаціў за нашу з вамі свабоду і незалежнасць. Упэўнены, што абноўлены вучэбна-метадычны комплекс стане важным сродкам захавання праўдзівай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, перадачы будучым пакаленням разумення таго, што адзінства і сапраўдная любоў да Радзімы — надзейная абарона ад любой пагрозы. Задача ўстаноў адукацыі — эфектыўна выкарыстоўваць усе кампаненты гэтага комплексу для фарміравання гістарычнай памяці ў маладога пакалення».

## Адчуць «жывы нерв» вайны

— Вучэбна-метадычны дапаможнік выдадзены на дзвюх мовах: рускай і беларускай. У яго было ўнесена шмат змен. Напрыклад, ён быў дапоўнены ацэнкамі падзей вайны, якія давалі іх сучаснікі: прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль, прэзідэнт Чэхаславакіі Эдвард Бенеш, брытанскі журналіст Аляксандр Верт, камандуючы 2-й танкавай арміі вермахта Гудэрыян. Гэта вельмі добры момант для фарміравання крытычнага мыслення і ўмення працаваць з інфармацыяй, — падкрэсліла Марына Краснова, адзін з аўтараў вучэбна-метадычнага комплексу. — У нас з'явілася рубрыка «Вайна на экране»: тут можна знайсці найбольш значныя і праўдзівыя кінастужкі, знятыя ў Беларусі і ў іншых краінах, якія найбольш дакладна паказваюць, што адбывалася ў гады вайны. Мы вылучылі рубрыку «Ураджэнцы Беларусі», каб школьнікі разумелі, у якіх падзеях бралі ўдзел ураджэнцы нашай зямлі, каб яны бачылі, што беларусы былі літаральна ўсюды: удзельнічалі ў бітвах на франтах, былі партызанамі і падпольшчыкамі. У вучэбным дапаможніку прыведзена вельмі вялікая колькасць прыкладаў гераізму нашых землякоў. На жаль, сучасныя дзеці не ведаюць імёнаў герояў, не ведаюць, у гонар каго названы вуліцы нашых гарадоў і як вайна адбілася на іх сям'і і на населеным пункце, дзе яны жывуць.

Таксама ў вучэбны дапаможнік мы ўключылі выявы твораў жывапісу. Да ілюстрацый пастаўлены пытанні, каб настаўніку было лягчэй арганізаваць работу ў класе. Дастаткова шмат уведзена новых дакументаў, дыяграм, ілюстрацый, картасхем. Упершыню ў вучэбнай літаратуры (і савецкага, і постсавецкага перыядаў) мы ўключылі картасхему падзелу Чэхаславакіі, які адбыўся пасля Мюнхенскай канферэнцыі, для таго, каб школьнікі бачылі, што адбылося з краінай і, самае галоўнае, хто прыняў удзел у раздзеле гэтай дзяржавы.



У абноўленым дапаможніку знайшлося месца і заданням па краязнаўстве. «Важную ролю ў патрыятычным выхаванні адыгрывае пошукавая, краязнаўчая работа. І яе правільная арганізацыя дазволіць даведацца навучэнцам пра герояў вайны, пра матывы іх подзвігаў. Істотную ролю ў актывізацыі пошукава-даследчай дзейнасці адыгрывае ўведзеная ў вучэбны дапаможнік рубрыка «Складаем летапіс вайны». На жаль, ветэранаў становіцца ўсё менш, таму заданні рубрыкі былі некалькі зменены, яна становіцца больш даследчай, пошукавай, мы стымулюем школьнікаў сходзіць у мясцовыя архівы, у музеі, знайсці тых, хто яшчэ можа падзяліцца нейкімі ўспамінамі пра вайну, — дадала старшы навуковы супрацоўнік. — Акрамя дапаможніка, мы падрыхтавалі абноўлены варыянт хрэстаматыі. У 2008 годзе быў выдадзены першы варыянт, а новы абноўлены практычна напалову. У хрэстаматыю мы ўключаем не толькі тэкставыя дакументы, але і статыстычныя звесткі, не толькі афіцыйныя дакументы, але і дакументы асабістага характару: урыўкі з успамінаў, з дзённікаў, лісты ўдзельнікаў вайны. Гэта таксама дапамагае адчуць «жывы нерв» вайны».

На думку **кіраўніка аўтарскага калектыву, сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, акадэміка Аляксандра КАВАЛЕНІ**, вучэбнаму дапаможніку складана паспець за інфармацыяй, якая пастаянна абнаўляецца, тым не менш да гэтага трэба імкнуцца:

— Напрыклад, раней лічылася, што ў Беларусі акупантамі і іх прыхвасцямі было спалена 9200 населеных пунктаў, а па новых звестках — іх звыш 10 тысяч. Сёння факты генацыду беларускага народа ў гады вайны даследуе Генеральная пракуратура. І гэта інфармацыя таксама павінна глыбока асвятляцца...

## Захаваць кожны факт і кожную дэталь

Школьныя педагогі падзяліліся сваім вопытам выкарыстання вучэбна-метадычнага комплексу «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)».

— Не ўсе настаўнікі валодаюць методыкай работы з мастацкім вобразам, камусьці лепш удаецца працаваць з дакументамі ці статыстычнымі звесткамі, а вучэбна-метадычны комплекс дазваляе кожнаму педагогу раскрыць свой педагагічны і выхаваўчы патэнцыял, — разважае **настаўнік гісторыі і грамадазнаўства барысаўскай гімназіі № 1 Вольга МАЕЎСКАЯ**. — Кожны знойдзе ў ім тое, што блізка. Гэта магутны сродак для навучання дзяцей, якія могуць быць логікамі, візуаламі і гэтак далей. Мы працуем з пакаленнем Z. Гэта дзеці з лінгвістычным, мастацкім, музычным інтэлектам... І эмоцыі адыгрываюць магутную ролю на такіх уроках. Да таго ж гэты курс дае магчымасць адказаць на пытанне, а хто такі сапраўдны мужчына і сапраўдная жанчына. У сучасным свеце, на жаль, такіх прыкладаў мы сустракаем недастаткова.

**Настаўнік гісторыі і грамадазнаўства мінскай гімназіі № 31 Людміла ГУРЫНОВІЧ**, адзін з аўтараў дапаможніка для настаўнікаў абноўленага вучэбна-метадычнага комплексу, адзначыла, што педагогі могуць працаваць і з аўдыяматэрыяламі, і з ілюстрацыямі, і з гістарычнай фатаграфіяй. У дапаможніку ёсць QR-коды, якія накіроўваюць да патрэбных рэсурсаў. Можна праслухаць прамову аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны і супаставіць яе з фатаграфіямі, зробленымі 22 чэрвеня 1941 года. Адбываецца паглыбленне дзяцей у той трагічны дзень, што выклікае моцныя эмоцыі. Можна даць заданне знайсці ў сучасным горадзе месца на фатаграфіі ваенных часоў. Цяперашнім дзецям цяжка ўявіць, як у акупаванай Беларусі друкаваліся газеты, на якіх матэрыялах і ў якіх умовах. Гэты раздзел курса іх вельмі цікавіць.

На думку педагога, трэба рабіць акцэнты на персаналізацыю гісторыі: падлеткаў цікавяць лёсы канкрэтных людзей. Настаўніца рэалізавала са сваімі вучнямі праект «Прадзядуля». Яны разам праз банк даных «Мемарыял» шукалі звесткі пра сваякоў, якія ваявалі на розных франтах. «Гэта быў вельмі эмацыянальны праект, — адзначыла яна. — А яшчэ дзяцей вельмі ўразіла інфармацыя пра тое, за колькі дзён фашысцкая Германія заваявала краіны Еўропы...»

**Дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна ГІНЧУК** расказала ўдзельнікам прэзентацыі аб тым, што на Рэспубліканскім савеце па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі была зацверджана Канцэпцыя школьнай гістарычнай адукацыі. Яна датычыцца не толькі школьных прадметаў — гісторыі Беларусі або інтэграванага курса гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, а закранае таксама пытанні міжпрадметных сувязяў. Закладзены ўзаемасувязі з беларускай літаратурай, грамадазнаўствам, геаграфіяй, шэрагам іншых дысцыплін. Яшчэ адзін найважнейшы аспект у плане навізны канцэпцыі — пытанне пазаўрочнай дзейнасці. Можна задзейнічаць мноства форм работы — экскурсіі, краязнаўчую дзейнасць, пошукава-даследчую работу, лекторыі, выязныя мерапрыемствы на месцы баявой славы і іншыя аб'екты, якія маюць важнае значэнне для фарміравання гістарычнай памяці...

**Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА** паведаміў, што да выдання рыхтуецца ўжо трэцяя кніга народнага летапісу Вялікай Айчыннай вайны. Акцыя «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх» ініцыявана НАН Беларусі ў 2020 годзе. Дзякуючы ёй у тых, каго закранула вайна і ў каго захаваліся матэрыялы, дакументы і фатаграфіі сваіх продкаў, якія змагаліся ў шэрагах Чырвонай Арміі, якія ўдзельнічалі ў партызанскім руху, падпольным супраціве, з'явілася магчымасць дасылаць успаміны ў Інстытут гісторыі. У цэнтры ваеннай гісторыі гэтыя матэрыялы сістэматызуюцца, аналізуюцца, апрацоўваюцца і рыхтуюцца да публікацыі. Ужо выдадзены дзве кнігі «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх». Сабраны матэрыялы і для трэцяй кнігі.

На сайце Інстытута гісторыі можна ўбачыць тыя артыкулы, якія апублікаваны ў першай і другой кнізе. Акрамя таго, вядзецца праца па стварэнні спецыяльнага навукова-інфармацыйнага партала пад умоўнай назвай «Летапіс. Памяць беларускага народа». Над гэтым працуюць вучоныя Інстытута гісторыі сумесна з супрацоўнікамі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі. Сайт будзе агульнадаступны з магчымасцю пошуку. Гэта дазволіць размясціць усю інфармацыю, якая паступае ў Інстытут гісторыі.

У сучасных геапалітычных умовах, калі не спыняюцца спробы фальсіфікацыі і скажэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, застаецца ўсё менш і менш непасрэдных сведкаў і ўдзельнікаў ваенных падзей, жыццёва важна захаваць для нашчадкаў кожны факт і кожную дэталь — усё, што стала ўвасабленнем духоўнай сілы беларускага народа ў цяжкія ваенныя гады.

Вадзім Лакіза звярнуўся да педагогаў з просьбай актывізаваць работу па зборы ўспамінаў і фатаграфій удзельнікаў падзей Вялікай Айчыннай вайны, зазірнуць у сямейныя архівы. Матэрыялы трэба накіроўваць у Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе будзе ажыццяўляцца збор інфармацыі, навуковая апрацоўка атрыманых звестак, падрыхтоўка на іх аснове адпаведных выданняў, а таксама стварэнне электроннай базы даных.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ігуменскі тракт
№ 33 (341)



Захаваныя традыцыі

# НОВЫЯ ГРАНІ ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА

**ПА добрай традыцыі днямі ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва» прайшло адкрыццё V Трыенале дэкаратыўнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў «Дэкарт-22». У экспазіцыі можна ўбачыць сучасныя тэкстыль, кераміку, шкло, батык, метал, створаныя за апошнія тры гады. Напярэдадні адкрыцця прадстаўнікі Міністэрства культуры, мастакі, скульптары і спецыялісты музейных устаноў сустрэліся, каб пагаварыць на тэму «Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: эстэтычнае выхаванне, імідж і прэзентацыя Беларусі ў свеце».**



— Апошнія гады асаблівая ўвага аддаецца адраджэнню і развіццю нацыянальных традыцый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, розных відаў народных рамёстваў, аб'яднанняў носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны і перадачы іх вопыту і ўменняў маладому пакаленню, фарміраванню нацыянальнага брэнда, — адзначыў **кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іван ГАЛАБУРДА**. — Неабходна паслядоўна вырашаць задачы папулярызацыі нацыянальных відаў народных мастацкіх рамёстваў і на іх аснове фарміраваць брэнд.

У якасці прыкладу прадстаўнік міністэрства згадаў Іванаўскую школу бондарства, якая сёння ўжо стала брэндам рэгіёна. Увогуле, калі казаць пра галіну дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў нашай краіне, сёння ў краіне існуе 104 Дамы рамёстваў, на базе якіх ствараюцца і іншыя клубныя аб'яднанні. Працуе 1880 аматарскіх калектываў і студый дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва (з іх 1665 для дзяцей). Гэтыя клубныя фарміраванні аб'ядноўваюць 16 334 удзельнікаў, у тым ліку 14 167 дзяцей. Найменне «народна-ўзорны» прысвоена 72-м такім калектывам, а пяць калектываў носяць званне «заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». Для нагляднасці Іван Іванавіч таксама распавёў, што ў 2021 годзе спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь папоўнілі 18 аб'ектаў, у ліку якіх 11 нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека. Беларускія аб'екты, уключаныя ў спіс ЮНЕСКА, становяцца ўсё больш вядомымі і пазнавальнымі на міжнародным узроўні. Так, у штаб-кватэру ЮНЕСКА ў 2021 годзе была накіравана намінацыя «Саломапляценне Беларусі. Мастацтва, рамяство і ўменне» для ўключэння ў рэпрэзентацыйны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, і ў снежні бягучага года запланаваны разгляд дадзенай намінацыі.

Што датычыцца фестывалю дэкаратыўнага мастацтва, то яго насычаная праграма дазваляе ўжываю пазнаёміцца з тым, як сёння выказваюцца, шукаюць сябе творцы розных кірункаў. Як адзначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ**, вельмі важна ўлічваць, што любое мастацтва — тэкстылю, керамікі, металу — заўсёды паходзіць з народнага, якое з'яўляецца крыніцай натхнення.

— Тое, што ў нас такая ўвага аддаецца традыцыйным рамёствам — дазваляе мастакам трансфармаваць сваё разуменне дэкаратыўнага мастацтва. І гэта добрая жывая сувязь паміж пакаленнямі і паміж пластамі народнага і прафесійнага мастацтва, — адзначыла Наталля Васільеўна. — Наша Трыенале дэкаратыўнага мастацтва мае ўжо сваю гісторыю. Сёлета праект паяднае рэчы як традыцыйныя, так і тыя, дзе выкарыстоўваюцца новыя і нечаканыя матэрыялы.

Убачыць палітру цікавага самавыяўлення як прафесійных мастакоў Мінска і рэгіёнаў, так і студэнтаў, можна ў Палацы мастацтваў і на шэрагу іншых выставачных пляцовак сталіцы.

— Акрамя агульнай экспазіцыі Трыенале ў Палацы мастацтваў, у нас паралельна будзе праходзіць яшчэ некалькі тэкстыльных праектаў. Адзін з іх мы распачалі ўжо на пачатку бягучага года. Гэта праект міні-тэкстылю, які мы праводзім другі раз, апрабаваўшы такі фармат на мінулым Трыенале. Фармат міні-тэкстылю вядомы ва ўсім свеце. У нашым праекце будуць прадстаўлены работы ў тэкстыльных матэрыялах і тэхніках, абмежаваныя па памеры (20 на 20 ці 30 на 30 сантыметраў). Такі памер работы дазваляе мастаку апрабаваць мабільна новыя матэрыялы, нейкую сваю ідэю, — дзеліцца **мастак па тэкстылю, старшыня секцыі тэкстылю Беларускага саюза мастакоў Вольга РЭДНІКІНА**. — Мы, калі думалі над тэмай выстаўкі, палічылі, што будзе цікава паказаць тэкстыль праз сінтэз абсалютна розных тэхнік і матэрыялаў. Работы нашых удзельнікаў зроблены з выкарыстаннем шкла, пластыку, сінтэтычных валокнаў і г. д. Яны часта выходзяць у прастору, у аб'ём, але ўсе праяўляюць сябе як тэкстыль, хоць часам і вельмі нечакана.

Так, у гарадской галерэі Шчамялёва можна завітаць на персанальную выстаўку яго дачкі, мастачкі Маргарыты Шчамялёвай «Лічбы», якая працуе ў тэхніцы класічнага габелену і мае свой пазнавальны стыль.

А калі хочацца атрымаць асалоду ад скульптурнай керамікі, то з 16 лістапада завітайце на выстаўку Terracota ў Арт-гасцёўню «Высокае места». Пасля 23 лістапада адкрыецца выстаўка эксперыментальнай керамікі ў мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага.

Прыгожым фінальным акордам стане «Калядная казка» Веры Блінцовай і Любові Кірылавай, што з 29 лістапада разгорнецца ў галерэі «Мастацтва» Беларускага саюза мастакоў. Абедзве мастачкі працуюць у тэхніцы тэкстыльнай мазаікі, і дадзены праект — добрая магчымасць пазнаёміцца з яе цікавай аўтарскай інтэрпрэтацыяй.

**Алена ДРАПКО.**

Пад вянец

# СУКЕНКА І «ПАВА» ДА ШЛЮБУ

Як англійская каралева і Како Шанель паўплывалі на моду брэсцкіх нявест



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

**Выставу вясельных убораў мінулага стагоддзя з лёдзію Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Тут можна ўбачыць сукенкі і мужчынскія касцюмы, туфлі, іншыя шлюбныя аксесуары мінулага стагоддзя, народныя строі, а таксама вянчальныя кароны і мноства здымкаў вясельных убораў нашага краю. Што цікава, экспанаты ўзятыя з фондаў музея, а таксама з прыватных калекцый гараджан і Музея Беларускага Палесся ў Пінску.**

## ВЯНЦЫ БЫВАЛІ ПАПЯРОВЫМІ

Аснову экспазіцыі ўтварылі вясельныя сукенкі другой паловы XX стагоддзя. Прадстаўлены здымкі і альбомы, запрашэнні, паштоўкі, пасведчанні аб заключэнні шлюбу розных гадоў. Цікавасць наведвальнікаў выклікаў не зусім звычайны для нашага часу дакумент 1930-х гадоў, які можна назваць перадшлюбным даследаваннем жаніха. Мужчына, што намерваўся ўзяць шлюб, павінен быў адказаць на пытанні разгорнутай анкеты: якога ён году нараджэння, ці быў жанаты раней, адкуль родам і гэтак далей, уключаючы маёмаснае становішча.

Вянцы другой паловы XIX стагоддзя, несумненна, знаёмыя сучаснаму чалавеку па фільмах і кнігах, а вось папяровыя вянцы пачатку 1930-х гадоў з Пінскага павета выглядаюць даволі нечакана. Гэта сапраўды ўнікальныя экспанаты вернісажу. Наведвальнікі ад надушна памыліліся ў вызначэнні мужчынскай і жаночай вянчальных карон. Усе падумалі, што больш вянец трымалі над жаніхом. Аказалася — наадварот. Экскурсавод растлумачыла, што галава нявесты была пакрытая вэлюмам, нярэдка пышна ўпрыгожаным, таму ёй патрабаваўся больш аб'ём вянца. Даводзілася здзіўляцца таму, якая ўсё ж багатая і разнастайная вясельная культура нашага краю!

— У кожнага народа ёсць свае базісныя каштоўнасці, на якіх будуецца грамадства, — сказаў на адкрыцці выставы **дырэктар абласнога краязнаўчага музея Аляксей МІЦЮКОЎ**. — Але ёсць каштоўнасці агульначалавечыя. У іх ліку — шлюб, сям'я, выхаванне дзяцей. Гэтыя каштоўнасці праходзяць праз усю гісторыю і культуру нашага народа. Вясельныя рытуалы прыйшлі да нас са старажытнасці. Кожнае пакаленне іх развівае, удасканальвае, перадае сваім дзецям і ўнукам. Пра гэта наша выстава. Выстава светлая, добрая, жыццесцвярджальная.

## КАРАЛЕВЫ АБО МАДЭЛЬЕРЫ?

**Куратар выставы, намеснік дырэктара музея па навуковай рабоце Вольга НОВІКАВА** расказала, як на моду, у тым ліку вясельную, уплываюць эканамічныя, палітычныя, культурныя працэсы, і мода такім чынам становіцца адлюстраваннем гістарычных падзей.

Відавочна, што не ўсе наведвальнікі выставы ведалі пра гісторыю белага шлюбнага ўбору. Звычай выходзіць замуж у белым з'явіўся аднosна нядаўна, якіх-небудзь 150 гадоў таму. А раней сукенка нявесты была каляровай. Нашы прапрабабулі выходзілі замуж у вышыванках. Дамы з багатага роду маглі надзець сукенкі любых колераў — чырвонага, срэбнага, залатога — абы выглядала раскошна і падкрэслівала прыгажосць. Сапраўдны пераварот у вясельнай модзе здзейсніла англійская каралева Вікторыя, калі ў 1840 годзе пайшла пад вянец у крэмавай атласнай сукенцы са шлейфам даўжынёй больш за пяць метраў. Усе венцаносныя асобы ўспрынялі гэта як сігнал да дзеяння і пачалі шыць светлыя і накат белыя ўборы. Каралева, дарэчы, з'явілася ў гэтай сукенцы яшчэ не раз, чым, несумненна, падавала прыклад, бо такі ўбор каштаваў вельмі дорага. А ў масавую моду белыя сукенкі ўвяла Како Шанель, яна ж спрасціла мадэлі, каб зрабіць іх больш даступнымі.

## І ПРАКТЫЧНА, І МОДНА

На мяжы вякоў і ў пачатку XX стагоддзя шлюбныя ўборы былі доўгімі. А вось 1920-я гады — час перамен і ломкі стэрэатыпаў, тады ў моду ўваходзіць кароткая сукенка, праўда, з доўгім вэлюмам. І не толькі ў ЗША і Еўропе. На выставе ёсць здымак, на якім красуецца модніца з Брэста над Бугам менавіта ў такім вясельным строі.

У 1950-я гады фарміруецца новы віток вясельнай культуры. У гэты час модніцы млеюць ад стылю Крысціяна Дыёра — пышная спадніца, тонкая талія. У такія адзяваюцца і нявесты з Брэстчыны. На выставе — сукенка з вёскі Агдэмер Драгічынскага раёна. Адкуль у вясковай дзяўчыны такая раскоша? Аказалася, строй ёй прыслалі сваякі з Канады. Гэта фабрычная элегантная сукенка да падлогі, у ёй пасля гаспадыні хадзілі да шлюбу многія дзяўчаты з Агдэмера.

Побач — кароткая вясёлая сукеначка 1970-х гадоў. Нехта з наведвальнікаў слушна заўважыў, што ўбор нечым нагадвае сукенку Зіначкі з фільма «Іван Васільевіч мяняе прафесію». Магло быць і так, тады модніцы нярэдка зарысоўвалі мадэлі з часопісаў, а то і тэлеэкрана. Гэтая мода прыйшла ў многім дзякуючы вобразу легендарнай Одры Хепбёрн. Сукенкі ў нас часта шылі з гіпюру, які не так проста было купіць, а на кароткую мадэль трэба менш тканіны — і практычна, і модна.

Але авангарднае міні пратрымалася нядоўга. Летам 1981 года пайшла пад вянец прынцэса Дзіяна. Яе сукенка зрабіла сапраўдны фурор у свеце моды: аб'ёмная, з шырокімі рукавамі, мноствам фальбон і россыпам жамчужын у складках. Тэндэнцыя хутка пайшла ў народ. І яе можна прасачыць па фотаздымках той пары. Адным словам, у асаблівы дзень усе нявесты хацелі быць прыгожымі — і былі такімі.

З традыцыямі цяперашняй вясельнай моды наведвальнікаў пазнаёміла гаспадыня брэсцкага вясельнага салона Edelweis Мая Кантаўскенэ. Мадэлі салона прадэманстравалі простыя на першы погляд і разам з тым стыльныя ўборы, якія адлюстроўваюць светаўспрыманне сучаснага чалавека.

Аздобіла і ажывіла адкрыццё выставы выступленне фальклорнай групы музея «Бездзежскі фартушок». Навуковыя супрацоўнікі і ўдзельнікі самадзейнага калектыву паказалі цікавы абрад з іх мясцовасці — фрагмент апранання нявесты. Маладую садзілі на хлебную дзяжу і надзявалі на галаву вясельны вянок — паву. Пава — даволі складаная канструкцыя, яе ўтвараюць рознакаляровыя кветкі, іх рабілі сваімі рукамі. Апраналі ж нявесту абавязкова пад абрадавыя песні.

Народныя строі, якія надзявалі пад вянец, таксама прысутнічаюць на выставе. Ёсць тут і знакаміты касцюм лелікаўскай сваці з Кобрынскага раёна, які занесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны Беларусі. Выстава будзе адкрытая да сярэдзіны снежня.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Спрадвечныя рамёствы

# «З-ПАД ПОПЕЛУ ВЫРЫВАЛІСЯ СІНЯВА-ЗАЛАТЫЯ АГНЁВЫЯ САЛАМАНДРЫ»

## Сем літаратурных кавалёў і сем рэальных кавальскіх вырабаў

**Калі падарожнічаеш па Беларусі, грэюць сэрца рэчы, якімі продкі ўпрыгожвалі сваё жыццё. Дзесьці захавалася жырандоля, дзесь — дзівосны каваны крыж, ці незвычайная агароджа, якая нагадвае карункі... Вырабы кавалёў, уладароў агню і жалеза.**

На Восеньскія Кузьмінкі, або свята Кузьмы і Дзям'яна, якое прыпадае на 14 лістапада, на Беларусі святкуюць Дзень кавалёў. Продкі лічылі, што ў гэты час божыя кавалі Кузьма і Дзям'ян куюць ледзяны ланцуг для зямлі, а яшчэ могуць скаваць для закаханых вяселле.

Кавалёў заўсёды шанавалі... Іх рамяство звязанае з мноствам казак, легендаў ды паданняў — і кавалі ў іх звычайна перамагаюць злую сілу. Шмат гісторый пра кавалёў прыдумалі і беларуская пісьменнікі... Давайце ўспомнім некаторыя.

### «ЯК ГРЫБЫ, ВЫВАРОЧВАЎ ЁН ДУБЫ»

Алесь Якімовіч напісаў сваю вершаваную казку «Каваль Вярнідуб» у 1930-м — у ёй пазнаюцца і біблейскія паданні, і народныя казкі... Вырашыў найлютышы цар, калі ў краіне пачаўся голад, пазабіваць усіх немаўлят. Адна Параска з малым сынам схавалася ў лесе. Хлопец вырас надзіва гожым і дужым — «Цераз месяц, як грыбы, выварочваў ён дубы». Калі Параска вярнулася ў родную вёску, Вярнідуб зрабіўся кавалём.

«І магутны той каваль
Як ніхто другі каваў.
Калі зробіць далато —
Не паломіш нізашто.
А як выкуе тапор
Ці нарог альбо сахор —
Не нацешацца дзядзькі:
Вось каваль у нас які!»

Вось толькі люты цар, даведаўшыся, што яго загад парушаны, угневаўся... Цяпер Вярнідубу трэба супрацьстаяць цэламу войску, што адпраўлена яго забіць. Скаваў Вярнідуб сабе булаву «сарака пудоў вагою, з ручкай гладкаю, прамою», і адправіўся на бітву... Па дарозе пераважыўшы шмат казачных прыгод. Салаўя-разбойніка перамог, вызваліў няшчаснага, якога пан пасадзіў у мурашнік, пабіў ваўкоў... Ну і цара лютага з усімі баярамі. Толькі не булавой — а мятлой чароўнаю іх вымеў.

### «ЗДАВАЎСЯ МНЕ ЧАРАДЗЕЕМ»

Дзед Змітрака Бядулі быў кавалём і меднікам. Бядуля ў аўтабіяграфічнай аповесці «У дрымучых лясах» успамінае: *«Больш за ўсё я любіў дзедаву кузню. Дзед, сінявокі, з доўгай рыжай барадой, у чорнай аксамітнай ярмолцы ды ў акулярах, прымацаваных ніткамі замест аглабелек, здаваўся мне чарадзеем. На яго горне пад попелам у вуголлях жыў вечны агонь. Даволі было толькі пару разоў памахаць кіем кавальскіх мяхоў, каб з-пад попелу вырывалася некалькі сінява-залатых агнёвых саламандраў. На палічках ляжала шмат разнастайных інструментаў: малаткі рознай велічыні і формы, друшлякі, свярдзёлкі, розных выглядаў абцугі, лудзільнікі, долаты, рашпілі, напільнікі, цыркулі, ножніцы, лінейкі, трыкутнікі...»*

Будучы пісьменнік любіў свайго мудрага дзеда... Нездарма ў аповесці «Сярэбраная табакерка» адзін з галоўных герояў — каваль Ксаверы, якога скамяніў злыдзень-пан.

### «І ШАЎКОВЫ ВУС КРАНЕ»

Верш Канстанцыі Буйло «Каваль» быў напісаны ў 1953 годзе і вельмі нагадвае савецкія фільмы таго часу. Фядос Баканаў вярнуўся з фронту ў родны калгас над Сожам. На фронце быў танкістам, пасля цяжкіх раненняў стаў рамантаваць танкі. Калгасу спатрэбіўся каваль, вось Фядос і заняўся пачэснай працай.

«А ў сяле дзяўчаты ходзяць,
Паглядаючы здаля
Сарамліва пры народзе
На Фядоса-каваля.
Больш за ўсіх глядзіць Марына,
Што працуе у садах,
Чарнавокая дзяўчына,
Галасістая, як птах.
А каваль ледзь гляне часам
І шаўковы вус кране,
Загаворыць нізкім басам,
Як калісьці на вайне:
— Хто умее працаваць,
Таго любяць паважаць».

Навёў Фядос парадак у сваёй хаце і замаркоціўся... Жаніцца пара! І маці выпраўляе ў клуб на танцы... У фінале шчаслівы Фядос танцуе з чарнавокай Марынай, і іх чакае светлая будучыня.

### «НЕДАРМА НАВОСТРАН МЕЧ»

Для паэта Уладзіміра Жылкі 1926 год быў вызначальным... Ён прыехаў з Прагі ў Мінск на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу — і так і застаўся ў БССР. У 1926-м ён яшчэ гарыць надзеяй і прагай дзейнасці, кавальская справа ж для яго — сімвал змагання за вызваленне Заходняй Беларусі і метафара паэзіі.

«Горан мехам раздзьмухаю,
Палажу на горан сталь.
Што рабіць, я знаю, знаю —
Недарма куе каваль!
Падзялілі чужаніцы,
У няволі старана.
Не скую у плуг паліцы —
Не прыдасца мне яна.
Закаваны люд мой, волат,
Крыўд нязлічаных цяжар.
Вышай, вышай верны молат,
Нестрыманы ў сэрцы жар...
Хлопцы, хлопцы,— на змаганне!
Гэй, крыўдзіцель, вораг, — прэч!
Нездарма каваў я зранні,
Недарма навостран меч».

### КАВАЛЬ З ЯСТРАБІНЫМІ ВАЧЫМА

У рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» ў галоўнага героя, Юрася Братчыка, ёсць мужны і верны паплечнік. Вось якім мы ўпершыню яго бачым:

*«...напярэймы возу ідзе знаёмы каваль, Кірык Вястун, боўдзіла... Твар адмыў, а рукі — чорт ты іх нават за тыдзень адмыеш. Смяецца, зубы прадае. Жоўты ў пшанічны колас, як агонь у ягонай кузні. Вочы ястрабіныя. Скураны фартух цераз плячо, у адной руцэ молат».*

Магутны Кірык Вястун ачольвае народнае паўстанне ў Гародні. Ён выдатны стратэг і вайскаводца. Паплечнік так прадстаўляе яго Юрасю Братчыку:

*«— Каб адразу зразумеў, з кім гаворыш, — сказаў Кляонік, — ведай: вось гэты каваль горад узняў, калі вас у катавальню пацягнулі».*

Менавіта каваль узначаліў атрад, што адбівае Юрася, якога сабраліся караць смерцю. А потым разам з Юрасём, яго каханай Анэляй і аднадумцамі зладжвае ў пушчы вольнае паселішча.

### СЕРП І ПЯРСЦЁНАК У ДАДАТАК

Верш Петруся Броўкі пра каваля прысвечаны каханню.

«У добрым калгасе бліз Нёмна сівога
Я знаў аднаго каваля маладога.
На волас чарнявы,
Высокі, рахманы,
Ды толькі не з гэтага
Меў ён пашану.
Не зоркім паглядам, не постаццю гнуткай
Праславіўся хлопец, —
Праславілі рукі!
Мне нават сказалі ў калгасе аднойчы:
— Ён выкуе месяц, як толькі захоча,
Павесіць паўночку на белай бярозе,
Каторы сапраўдны — ніяк не адрозніш!»

Майстар «адно толькі знае — усё звоніць і звоніць... Гадалі — ніхто ўжо яго не палоніць?» Але малая, бялявая Зося прынесла кавалю навастрыць серп, і «Як глянуў каваль ёй у вочы-азёры, — увесь разгубіўся ды ў іх утапіўся». Разам з сярпом каваль паабяцаў дзяўчыне скаваць чароўны пярсцёнак:

«Прыложыш да вока —
Пабачыш далёка,
Калі ж загадаеш,
Каханка пазнаеш!»

Ну і скаваў... Як ні паглядзіць Зося на пярсцёнак — бачыць аблічча каваля!

### РЫБКІ ЗОЛАТАКАВАЛЯ БЕЛАВАЛОДА

Дзеянне рамана Леаніда Дайнекі «След ваўкалака» адбываецца ў часы Усяслава Чарадзея. Адзін з герояў — Белавалод, вучань у ювелірнай кавальні менскага залатара Дзяніса. «Было яму васямнаццаць сонцаваротаў, і быў ён лёгкі, спрытны, дужы, адважны». Вучыў яго майстар *«пісаць вадкім золатам па медзі, вучыў з меднага, залатога і срэбнага дроту рабіць пярсцёнкі і колты. У коўніцы пахла воскам, з якога рабілі формачкі для адліўкі матрыц, пахла дымам і драўняным вугалем і заўсёды дробненька грукаделі малаточкі і зубільцы... Рука ў Белавалода была моцная, але лёгкая, метал слухаўся яе»*.

Каб з'яднацца з каханай Ульяніцай, давялося золатакавалю Белавалоду ўцякаць з дому. Сустракаўся і з князем Усяславам, вызваляў яго з порубу, быў у яго дружыне. А для любай Ульяніцы — упрыгажэнне: *«Тры бляхі ў выглядзе вясёлых рыбак былі скручаны з танюсенькага срэбнага дроту і напаяны на залатую аснову. Вочы рыбак, луску, плаўнікі ювелір зрабіў з найдрабнейшых залатых зярнятак. Рыбкі злучаліся паміж сабой абручыкам з чырвонай медзі»*.

* * *

*А цяпер вашай увазе — некаторыя з тых рэальных кавальскіх вырабаў, што трапіліся падчас вандровак і запомніліся — ці майстэрствам каваля, ці адметнай гісторыяй, ці проста выклікалі яркія пачуцці.*

**1. Жырандоля з Крошынскага касцёла**



Зразумела, пачнём са знакамітай жырандолі з жаўранкамі, выкаванай Паўлюком Багрымам. Хто толькі не пісаў пра сялянскага хлопчыка, сасланага ў жаўнеры за тое, што складаў на беларускай мове вершы, праз шмат гадоў вярнуўся на радзіму і стаў кавалём. Яго гісторыю распавёў Ігнат Яцкоўскі ў творы «Аповесць з майго часу, або Літоўскія прыгоды». Там і працытаваў адзіны вядомы верш Паўлюка Багрыма «Зайграй, зайграй, хлопча малы». Сёння даследчыкі лічаць, што верш склаў сам Яцкоўскі... Як для мяне — дык добры верш не павінен нічога страчваць з-за змены аўтарства... А жырандоля з чыгуну і бронзы, сапраўды выкаваная Паўлюком Багрымам, вісіць сёння ў Крошынскім касцёле.

**2. Птушыная клетка ў Мірскім замку**



У Мірскім замку ў адной з ніш у магутным муры прыцягнула маю ўвагу каваная клетка, у якой сядзіць белая парцалянавая галубка з залатымі сэрцайкамі... Гэтая работа мастака Паўла Пракапцова нагадвае пра легенду Мірскага замка... Тры сыны Юрыя Ільініча біліся за спадчыну. Сярэдні сын, Станіслаў, які чатыры гады валодаў бацькоўскім замкам, быў атручаны проста за бяседным сталом. Старэйшы брат Іван і малодшы, Шчасны, знайшлі вінавата: жонку сотніка па прозвішчы Навіцкая. Няшчасную абвінавацілі ў вядзьмарстве. Некаторыя кажуць, што Навіцкая была закаханая ў князя Станіслава, які стаў яе палюбоўнікам... Жанчыну спалілі на вогнішчы, і яе дух прылятае ў замак у выглядзе вось такой галубкі.

**3. Брама касцёла св. Мікалая ў Геранёнах**



У Геранёнах, у касцёле Святога Мікалая, калісь узведзеным Альбрэхтам Гаштольдам, дзе вянчаліся Барбара Радзівіл і кароль Жыгімонт Аўгуст, мяне ўразіла дэталь: на каваных варотах — мальтыйскія крыжы. Чаму? Аказалася, Ігнацій Кароль Корвін-Мілеўскі, які ў XIX стагоддзі валодаў Геранёнамі, вырашыў здабыць графскі тытул. Замка прад'явіць не было магчымасці — руіны... Ігнацій на матчын пасаг купляе ў Ватыкане графскі тытул, дзеля чаго мусіў уступіць у Мальтыйскі ордэн, то-бок стаць мальтыйскім рыцарам. Вось адкуль крыжы на варотах — граф і рыцар хваліўся новым статусам.

**4. Жырандоля ў Красным Беразе**



Калі мы наведвалі сядзібу Козел-Паклеўскіх у Красным Беразе, што каля Жлобіна, уразілі інтэр'еры — змяшаліся розныя стылі, ад готыкі да неамаўрытанскага. А ў лесвічным пралёце — цудоўная каваная жырандоля ў стылі ар-нуво, і столь аднаго з пакояў аздобленая кованымі галінкамі і кветкамі. Ну і вадасцёкавыя трубы-хімеры на фасадзе дадаюць каларыту.

**5. Станцыя метро «Кавальская Слабада»**



Калі не былі яшчэ на станцыі мінскага метро «Кавальская Слабада» — з'ездзіце, палюбуйцеся сярод іншага на работы Марыі Тарлецкай. Тое, што беларуская жанчына можа скараць агонь і жалеза, пацвярджаюць «Кавальскія выцінанкі», што ўпрыгожваюць станцыю.

**6. Крыжы Будслава**



Каля сцен Будслаўскага касцёла сёння можна ўбачыць два незвычайныя крыжы — жалеза з пачарнелым дрэвам, пакарабачаныя кавалкі металу на іх... Гэта памяць пра пажар, які адбыўся ў касцёле ў 2021 годзе, а крыжы зробленыя з абгарэлых тады бэлек.

**7. Галубы Старых Габаў**



